Камуністы 1933 № тыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 1 1933 г. АЎТОРАК № 168 (4712)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Аб спыненьні калгаснага і індывідуальна-сялянскага гандлю хлебам

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

У АДПАВЕДНАСЬЦІ З ПАСТАНОВАЙ СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ЗА 20 ЧЭРВЕНЯ 1933 г. «АБ АБАВЯЗКОВЫХ ПАСТАЎКАХ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ КАЛГАСАМІ І АДНААСОБНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ З УРАДЖАЮ 1933 г. НА ПАДСТАВЕ ЗАКОНУ АД 19 СТУДЗЕНЯ 1933 г.» САВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР І ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ СПЫНІЦЬ З 1-га ЖНІЎНЯ 1933 г. КАЛГАСНЫ І ІНДЫВІДУАЛЬНА-СЯЛЯНСКІ ГАНДАЛЬ ХЛЕБАМ.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. ГАЛАДЗЕД.

28 ліпеня 1933 г. САКРАТАР ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО.

Аб спыненьні калгаснага гандлю бульбай і дэцэнтралізаваных бульбы да поўнага выкананьня дзяржаўнага плану бульбазагатовак і ссыпкі насеннафонду

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

САВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ ЗАБАРАНІЦЬ З 1-ГА ЖНІЎНЯ 1933 ГОДУ ДА ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ЗАЦЬВЕРДЖАНАГА ГАДАВОГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА ПЛЯНУ ПАСТАЎКІ БУЛЬБЫ ДЗЯРЖАВЕ І ЗАСЫПКІ, ПАСЬЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПАСТАВАК ДЗЯРЖАВЕ, НАСЕННЫХ ФОНДАЎ КАЛГАСНЫ І ІНДЫВІДУАЛЬНА-СЯЛЯНСКІ ГАНДАЛЬ, А ТАКСАМА ДЭЦЭНТРАЛІЗАВАНЫХ БУЛЬБЫ.

НАМ. СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР І. ЛЬЧОЎ.

КІРАЎНІК СПРАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

Па-бальшавіцку рэалізаваць рашэньні пленуму

Сёньня мы публікуем пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. Гэтыя пастановы зьяўляюцца баявой праграмай работы для ўсёй партыйнай арганізацыі Беларусі, ключом да вырашэньня тых вялізарнейшых задач, якія стаяць перад КП(б)Б.

Указаньні правадыра партыі і рабочай клясы тав. СТАЛІНА зьявіліся тым адпраўным пунктам, вакол якога працякалі ўсе работы пленуму ЦК і ЦКК.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК пабальшавіцку падышоў да вырашэньня ўсіх пытаньняў, якія стаялі ў парадку дня. Сэкцыйная работа, разгортваньне дзелавой бальшавіцкай крытыкі, за бясьпечылі сапраўды глыбокае вырашэньне ўсіх пытаньняў. Адным з цэнтральных пунктаў работы пленуму зьявілася падвядзеньне вынікаў веснавой сяўбы, правядзеньне ўборкі і дзяржаўных паставак.

Плян веснавой сяўбы БССР выканала з посьпехам. Мы завяршылі сяўбу на 20 дзён раней мінулага году. У вогуле БССР засеяла 2.683.096 га, або 100,1 проц. пляну. Засеялі хутчэй і лепш, чым у мінулым годзе. У тэрмінах сяўбы, як падкрэсьліў пленум, БССР вышла ў пік перадавых рэспублік Саюзу, заваяваўшы першынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю. Нашы посьпехі зьявіліся простым рэзультатам упартай работы КП(б)Б пад апэрацыйным кіраўніцтвам ЦК на чале з тав. Гікалю, рэзультатам упартай барацьбы з кулацкім ворагам і яго агентурай правымі і «левымі» апартуністамі, яны ёсьць вынік сапраўднага ленінскага кіраўніцтва і дапамогі з боку ЦК УсеКП(б), правадыра партыі і рабочай клясы тав. Сталіна.

Мы з усёй рашучасьцю павінны падкрэсьліць, што атрыманыя намі перамогі ў веснавой сяўбе ўсё-ж зьяўляюцца яшчэ невыстарчальнымі. Большая насычанасьць сельскай гаспадаркі машынамі, арганізацыя такіх апорных пунктаў у вёсцы, як палітаддзелы, вялізарны ўздым творчай энэргіі шырокіх працоўных мас, значна ўмацаваныя як арганізацыйна, так і палітычна калгасы,—усё гэта стварыла ўсе магчымасьці для таго, каб пасеяць значна раней і лепш. На гэтым з надзвычайнай сілай і бальшавіцкай яснасьцю завастрыў увагу пленум ЦК і ЦКК.

Веснавая сяўба з усёй відавочнасьцю паказала, што ня ўсе арганізацыі аказаліся на ўзроўні тых задач, прад'яўляемых новай абстаноўкай і новымі ўмовамі, у якіх мы зараз знаходзімся. Кіраўніцтвы віцебскай, магілеўскай, гарадоцкай і раду іншых арганізацый ня ўлічылі гэтай новай абстаноўкі і новых задач, ня ўжылі канкрэтных мер да рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна ад работе на вёсцы і ў рэзультаце гэтыя раёны ганебна зрывалі сяўбу, цягнулі крывую ходу сяўбы ў Беларусі ўніз. Замест бальшавіцкай апэрацыйнай работы ў гэтых арганізацыях існавалі славесна-дакладчарскія мэтады кіраўніцтва, самаўпанскія адносіны да выкананьня пастаўленых партыяй задач.

Пленум асабліва рэзка падкрэсьліў, што выкананьнем пляну веснавой сяўбы зроблен толькі першы крок для пасьпяховага правядзеньня ўсіх сельска-гаспадарчых работ гэтага году. Пленум падкрэсьліў, што «ніякім дэмабілізацыйным настроям, элемэнтам самазаспакоенасьці не павінна быць месца, бо асноўная работа, больш напружаная, яшчэ ўпераздзе». Бальшавіцкая арганізацыя ўборачных работ, поўнае і хуткае выкананьне пляну ўсіх відаў дзяржаўных загатовак, падрыхтоўка і правядзеньне асеньняй сяўбы, — вось што зьяўляецца важнейшым рашаючым зьвяном у рабоце усёй КП(б)Б.

Тэрміны ўборкі, устаноўленыя ЦК, павінны легчы ў аснову работы кожнай партарганізацыі, кожнага камуніста і камсамольца, кожнага сумленнага беспартыйнага калгасьніка і працоўнага аднаасобніка. Правільная арганізацыя працы на палявых работах, перанясеньне цэнтру цяжару ў брыгаду, зьвяно, правільная пастаноўка ўсёй партыйна-масавай і арганізацыйна-выхаваўчай работы, расстаноўка партыйных сіл, шырокае разгортваньне сацыспаборніцтва і ўдарніцтва, заваяваньне першынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю, ШТОДЗЕННАЯ БАРАЦЬБА ЗА ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ, перамаганьне супраціўленьня кулацкага ворага і яго агентуры—вось што забясьпечыць посьпех уборкі і загатовак.

Трэба рашуча і беспаваротна пакончыць з дэкларацыйнасьцю, штампоўшчынай, зэсядацельскай мітусьнёй, да якой так прывыкілі некаторыя раённыя партыйныя арганізацыі. Не апартуністычным самацёкам, не фразёрствам, дэкларацыйнасьцю, «лявацкімі» разважаньнямі: «нам усё ні па чым», а ўпартай старанной работай трэба дабіцца перамогі за перамогай на фронце ўборкі і загатовак.

Тэрміны, устаноўленыя ЦК, зьяўляюцца зусім рэальнымі. Усякія спробы іх расьцягнуць павінны атрымаць зьнішчальны адпор, бо кожны дзень, кожная гадзіна перастою збожжа наносіць вялізарную шкоду народнай гаспадарцы, прыводзіць да страт сацень, тысяч цэнтнэраў збожжа. Адначасова трэба з усёй рашучасьцю змагацца супроць «лявацкай», адміністратарскай, галавакружнай «гульні ў тэрміны», якая, зьніжаючы якасьць уборкі, таксама прыводзіць да вялізарных страт. Тэрміны ЦК увасабляюць у сябе барацьбу за тэмпы з барацьбой за якасьць. За дакладнае выкананьне іх павінен змагацца кожны камуніст, кожная партыйная ячэйка.

Асабліва ўвага павінна быць зьвернута на арганізацыю ўборкі і загатовак у аднаасобным сэктары. Тут больш чым дзе-б там ні было павінна быць праяўлена максымальная гібкасьць, апэрацыйнасьць і масавасьць у рабоце. Усякія спробы ігнараваць аднаасобніка граюць толькі на руку клясаваму ворагу. Партарганізацыі павінны прыняць усе меры да таго, каб разгарнуць сапраўдную масавую работу з аднаасобнікамі, мабілізаваць іх на хуткае і поўнае выкананьне пляну ўборкі і дзяржаўных паставак.

Дзяржаўныя пастаўкі гэтага году вызначаюць задачу па арганізацыі бязупынкага патоку збожжа ад малатарні да элеватару, поўнасьцю ажыцьцяўляючы першую і асноўную запавядзь — выкананьне абавязку перад дзяржавай.

Клясавы вораг і яго агентура прабуюць сарваць правядзеньне закону ад дзяржаўных пастаўках. Гэтым спробам клясавага ворага павінен быць нанесен сакрушальны ўдар. Партарганізацыі павінны ўзьняць яшчэ вышэй сваю клясавую пільнасьць, яшчэ мацней граміць ворага і яго агентуру — правых і «левых» апартуністаў.

Прамысловасьць БССР працуе яўна нездавальняюча. Прамфінплян па ўсіх паказальніках з кварталу ў квартал ня выконваецца. Няма і ня можа быць ніякіх аб'ектыўных прычын, якія-б хоць у малейшай ступені апраўдвалі гэта ганебнае становішча. Толькі адсутнасьцю бальшавіцкай перабудовы кіраўніцтва прамысловасьцю, саюзнапанскімі мэтадамі работы трэстаў, аб'яднаньняў, наркамлегпрому БССР у цэлым можна вытлумачыць гэта недапушчальнае адставаньне. За работу прамысловасьці вялікая адказнасьць падае і на прафсаюзныя арганізацыі, якія яшчэ ў поўнай меры не ўзначаліці творчага энтузіязму мас, не ўваходзяць у штодзённае жыцьцё і работу вытворчасьці.

Усё гэта патрабуе ад усіх арганізацый рэспублікі мабілізаваць усе сілы на неадкладную ліквідацыю адставаньня прамысловасьці. Гістарычныя пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб вугольнай прамысловасьці, аб транспарце павінны быць у найкарацейшы тэрмін адпаведным чынам, з улікам асаблівасьцяй лёгкай прамысловасьці, праведзены ў жыцьцё.

Партыя ня можа і не дапусьціць у далейшым такіх ганебных прарываў, якія ёсьць у прамысловасьці Беларусі.

Пленум цалкам ухваліў пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб перабудове работы на транспарце і пастанову ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах.

Работа чыгунак БССР (Заходняй і МББ) за апошні час яўна пагоршылася. Мы маем значны рост крушэньняў, парушэньняў працоўнай дысцыпліны, зрывы спаранай ямды, рост паўторнасьці рамонту—зьнікненьне плянаў пагрузкі і г. д. Усё гэта зьяўляецца простым рэзультатам збанкрутаваўшых фармальна-бюракратычных мэтадаў кіраўніцтва з боку дырэкцый дарог і рэнаў, рэзультатам засьмечанасьці раду зьвеньняў апарату клясава-чужымі, шкодніцкімі элемэнтамі, абсалютна недавадальняючай работы транспартных арганізацый, дрэннай работы камуністаў, якія не аўладалі тэхнікай і ня здолелі па-бальшавіцку змагацца за ажыцьцяўленьне 6 гістарычных умоў тав. Сталіна на транспарце.

Практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК на чыгунках БССР сустрэла яўны саботаж. Акасьцянелыя, чыноўніцка-бюракратычныя элемэнты, перараджэнцы, двурушнікі на сповах ухвалялі пастановы аб перабудове работы на транспарце, а на справе імкнуліся зьвесьці ўсю перабудову да чыноўніцкай перастаноўкі сталоў. Гэты саботаж ня сустрэў бальшавіцкага адпору з боку раду партыйных арганізацый транспарту, і яшчэ на сёньняшні дзень сабатаж ня зломлен. Тэмпы перабудовы работы на транспарце застаюцца ўсё яшчэ недапушчальна марудными. Мы яшчэ ня маем сапраўды бальшавіцкай барацьбы з боку транспартных арганізацый за хутчэйшае і поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК. Такое становішча бязумоўна ня можа быць цярпіма ні аднаго дня, ні аднэй гадзіны.

Неадкладнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК, неадкладная перабудова работы транспарту зьяўляюцца балявым экзамэнам для бальшавікоў транспарту. На гэтым трэба паказаць сваю адданасьць партыі, сваю здольнасьць змагацца за яе генэральную лінію.

Пленум папярэдзіў усіх камуністаў, работнікаў чыгункі, што «ПАРТЫЯ ПАСТАВІЦЬ ПА-ЗА РАДАМІ ЎСІХ ТЫХ, ХТО СВАІМ ПРЫМІРЭНЦТВАМ, ГНІЛА-ЛІБЭРАЛЬНЫМІ, МЯШЧАНСКА-АБЫВАТАЛЬСКІМІ АДНОСІНАМІ БУДЗЕ ПЕРАШКАДЖАЦЬ АЗДАРАЎЛЕНЬНЮ ТРАНСПАРТУ».

Усл ўвага, усе сілы партыйных арганізацый павінны быць накіраваны на тое, каб у максымальна-кароткі тэрмін дабіцца карэннага пералому ва ўсёй рабоце транспарту. Трэба бязьпітасна выгнаць з радоў транспартнікаў усё гнілое, разпажэўшаяся, выкарчаваць закасьцянеласьць, непаваротлівасьць, бюракратызм, неадкладна выправіць дапушчаныя грубыя памылкі ў рабоце і прывесьці транспарт да асеньня-зімовых перавозак у поўнай баявой гатоўнасьці.

Чыстка КП(б)Б ужо з самага пачатку дала значнае ажыўленьне партыйна-масавай работы, павысіла бальшавіцкую баяздольнасьць, дысцыпліну ў партарганізацыі. Яна дала рэзкі зрух у справе марксыцка-ленінскага тэарэтычнага ўзбраеньня членаў і кандыдатаў партыі. Значна ўзрасла палітычная і вытворчая актыўнасьць рабочых, калгасных і працоўных мас аднаасобнікаў.

Рэспубліканская камісія па чыстцы, якая ўзначальваецца тав. АНЦІПАВЫМ, прарабіла вялізарную работу па арганізацыі, разгортваньні і кіраўніцтве чысткай. Дакладны падбор кандыдатур у праверкомы, канкрэтная, апэрацыйная дапамога і кіраўніцтва раённымі камісіямі, выяўленьне і выпраўленьне памылак і недахопаў, меўшых месца пры правядзеньні чысткі ў радзе раёнаў, бальшавіцкая прынцыповасьць, спалучэньне задач чысткі з выкананьнем гаспадарчых і палітычных задач, што стаяць перад КП(б)Б—усё гэта стварыла здаровую бальшавіцкую абстаноўку і значна павысіла бальшавіцкую баяздольнасьць усёй КП(б)Б.

Пленум асабліва рэзка падкрэсьліў, што ў працэсе чысткі і разгортваньня самакрытыкі павысілася рэвалюцыйная пільнасьць у радох партыі і рабочай клясы. Гэта дало магчымасьць выкрыць клясава-чужыя элемэнты, перараджэнцаў і агентаў клясавага ворага, якія пралезьлі у рады партыі і, прыкрываючыся партыйным білетам у кішэні, часта выступаюць пад фальшыва-нацыянальным сьцягам. У працэсе чысткі выяўлена двурушніцкая работа праваапартуністычных, трацкісцкіх вялікадзяржаўніцкіх, нацыянал-апартуністычных, бундаўскіх і інш. контррэвалюцыйных дробна-буржуазных элемэнтаў.

Ачышчэньне радоў партыі ад гэтых клясава-чужых элемэнтаў, ашуканчым шляхам пралезшых у партыю, яшчэ больш павысіць клясавую баяздольнасьць арганізацый у барацьбе за генэральную лінію партыі.

Чыстка бязумоўна аказвае і акажа свой мабілізуючы ўплыў на правядзеньне ўборкі ўраджаю, збожжаздачы дзяржаве і выкананьне іншых важнейшых гаспадарча-палітычных задач партыі, на ліквідацыю адставаньня работы прамысловасьці, асабліва па ГОМЕЛЮ, ВІЦЕБСКУ, МЕНСКУ і БАБРУЙСКУ.

Партарганізацыі абавязаны замацаваць рэзультаты чысткі ў кожнай асобнай ячэйцы і ў кожнай партыйнай арганізацыі ў цэлым. Трэба забясьпечыць карэнную перабудову ўсёй партыйнай работы ў бок разгортваньня сапраўды арганізатарскай і глыбока-палітычнай масавай работы, рашуча адмовіўшыся ад практыкі голага адміністраваньня, якое мела месца ў асобных раёнах. Трэба ахапіць палітычным уплывам і бальшавіцкім узьдзеяньнем кожнага рабочага і калгасьніка, умацаваць нізавое і сярэдняе зьвеньні на прадпрыемстве, у саўгасе, калгасе.

Асабліва рэзка павінна быць узьнята выхаваўчая работа сярод членаў і кандыдатаў партыі. Вывучаючы выяўляемы ў ходзе чысткі пепшы і адданы нам беспартыйны актыў, партыйныя арганізацыі павінны разгарнуць вялікую работу па вырошчваньні гэтага актыву на канкрэтнай рабоце па выкананьні баявых задач партыі.

Выкананьне бальшавіцкіх пастаноў пленуму зьяўляецца баявым і першачарговым абавязкам кожнага камуніста, кожнай партыйнай ячэйкі. Трэба давесьці пастановы пленуму да шырачайшых мас з тым, каб ператварыць іх у магутную зброю выкананьня ўсіх нашых гаспадарча-палітычных кампаній.

Яшчэ больш павысім клясавую пільнасьць. Яшчэ мацней будзем змагацца за бальшавіцкае правядзеньне ўборкі, збожжаздачы і асеньняй пасеўнай кампаніі. Адкажам на пастановы пленуму ЦК і ЦКК канкрэтнымі дзеяньнямі, увасобленымі ў жывую, матар'яльную сілу.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК на чале з тав. Гікалю яшчэ з большай бальшавіцкай непрымірымасьцю будзе змагацца за выкананьне гаспадарча-палітычных задач, за генэральную лінію партыі, яшчэ больш згуртуе свае рады вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі і рабочай клясы тав. Сталіна.

ПАСТАНОВЫ ЛІПЕНЬСКАГА АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК КП(б)Б АБ ВЫНІКАХ СЯЎБЫ, ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЎБОРКІ І МАЛАЦЬБЕ, АБ АБАВЯЗКОВЫХ ПАСТАЎКАХ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ КАЛГАСАМІ І АДНААСОБНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ З УРАДЖАЮ 1933 ГОДУ, АБ ХОДЗЕ ЧЫСТКІ КП(б)Б І АБ ЗАДАЧАХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ БССР ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ Ў ЖЫЦЬЦЁ ПАСТАНОЎ ЦК УсеКП(б) І СНК СССР АБ ПЕРАБУДОВЕ РАБОТЫ НА ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ—ЧЫТАЙ НА 2-ОЙ І 3-ЯЙ СТАР.

ТРЫЦЦАЦЬ ГОД БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ (1903-1933)

1. Трыццаць год таму назад, 30 ліпеня—23 жніўня 1903 г. засядаў II ЗЬЕЗД РАСІЙСКАЙ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ РАБОЧАЙ ПАРТЫІ. Трыццацігодзьдзе II зьезду партыі—ТРЫЦЦАЦІГОДЗЬДЗЕ БАЛЬШАВІЗМУ.

За гэтыя трыццаць год бальшавіцкая партыя—«розум, гонар і сумленьне нашай эпохі» (ЛЕНІН, т. XXI, ст. 95),—прашла слаўны і гераічны шлях, вырасла ў магутную сілу, кіруючую савецкай дзяржавай і сацыялістычным будаўніцтвам, ударную брыгаду міжнароднага пралетарыяту, якая апіраецца на самаахвярнае падтрыманьне рабочых, працоўных сялян, прыгнечаных народаў усяго сьвету, якая патрасае асновы сусьветнага капіталізму. БАЛЬШАВІК—слова, народжанае ў баёх II зьезду—увайшло ва ўсе мовы, як сынонім пасьлядоўнага пралетарскага рэвалюцыянэра. Імя ЛЕНІНА, вялікага правадыра бальшавізму, увасабляючага ўсю гісторыю бальшавіцкай партыі, стала самым вядомым і самым улюбёным імем для соцень мільёнаў працоўных усіх краін. Імя ЛЕНІНА стала сьцягам барацьбы за перамогу камуністычнай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце.

2. Бальшавізм прарабіў «практычную гісторыю, якая па багацьці вопыту ня ведае сабе роўнай у сьвеце» (ЛЕНІН, том XXV, ст. 175).

«Ні ў адной краіне за гэтыя 15 год,—пісаў Ленін, маючы на ўвазе ДАКАСТРЫЧНІЦКУЮ гісторыю бальшавіцкай партыі, ня было перажыта нават прыблізна так многа ў сэнсе рэвалюцыйнага вопыту, хуткасьці і рознастайнасьці зьмены розных форм руху, легальнага і нелегальнага, мірнага і бурнага, падпольнага і адкрытага, гурткоўага і масавага, парляманцкага і тэрарыстычнага. Ні ў адной краіне ня было сканцэнтравана на такім кароткім прамежку часу такога багацьця форм, адценьняў, мэтадаў барацьбы ўсіх клясаў сучаснага грамадзтва, прытым барацьбы, якая, у сілу адсталасьці краіны і цяжкасьці гнёту царызму, асабліва хутка насьпявала, асабліва прагна і пасьпяхова ўсвойвала сабе адпаведнае «апошняе слова» амэрыканскага і эўрапэйскага палітычнага вопыту». (ЛЕНІН, т. XXV, ст. 175).

Яшчэ больш багаты, рознастайны, канцэнтраваны 15-гадовы ПАСЬЛЯКАСТРЫЧНІЦКІ вопыт нашай партыі. Узброенае паўстаньне і захват пралетарыятам улады; будаўніцтва савецкай пралетарскай дзяржавы; мабілізацыя актыўнасьці і ініцыятывы найшырэйшых мас пралетарыяту і бядняцка-сераднякцкага сялянства; бязьпітаснае прыдушэньне скінутых эксплёататараў, якія шалёна супраціўляюцца; арганізацыя ўзброеных сіл рэвалюцыі і кіраўніцтва гераічнай барацьбой Чырвонай арміі супроць белагвардзейшчыны і інтэрвэнтаў; пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва; пераўтварэньне на шай краіны з аграрнай у індустрыяльную; сацыялістычная перабудова сялянства і ліквідацыя кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі; пабудова эканамічнай базы сацыялізму; магутны ўздым сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва; найвялікшая культурная рэвалюцыя; вызваленьне прынечаных народнасьцей і росквіт культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьместу; разгром клясавага ворага, які ўжывае самыя розныя формы барацьбы; разгром агентуры клясавага ворага ў партыі—апартуністаў усіх масьцей і адценьняў, трацкістаў, правых, прымірэнцаў; кіруючая роля ў стварэньні і барацьбе Камуністычнага Інтэрнацыяналу, — такі рознастайны і багацейшы вопыт партыі, упэршыню ў чалавечай гісторыі кіруючай краінай дыктатуры пралетарыяту.

ТРЫЦЦАЦІГОДЗЬДЗЕ БАЛЬШАВІЗМУ—СУСЬВЕТНА-ГІСТАРЫЧНАЯ ПЕРАМОГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВЧУЭНЬНЯ МАРКСА І ЭНГЕЛЬСА, ЛЕНІНА І СТАЛІНА. Трыццацігодзьдзе шлях бальшавіцкай партыі—найвялікшае пацьвярджэньне РАШАЮЧАЙ РОЛІ І ЗНАЧЭНЬНЯ ПАРТЫІ ў барацьбе пралетарыяту за сацыялістычную рэвалюцыю, за дыктатуру пралетарыяту, за камунізм.

II ЗЬЕЗД і ЯГО ГІСТАРЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ

3. Эпоха ўзьнікненьня і афармленьня бальшавізму—эпоха вялізарнейшых зрухаў у сусьветнай эканоміцы, эпоха нябывалага абвастрэньня клясавых супярэчнасьцяй і клясавай барацьбы. Капіталізм перарос у імпэрыялізм,—загні ваючы, паміраючы капіталізм; разьвіцьцё капіталізму стала скачкападобным, катастрафічным. Наш[illegible] ПЯРЭДАДЗЕНЬ САЦЫЯЛІСТЫЧН[illegible]ЭВАЛЮЦЫІ.

Перад рабочым рухам з усёй вострасьцю паўсталі новыя задачы арганізацыі і рэвалюцыйнага выхаваньня мас, задачы падрыхтоўкі да рашаючых баёў за дыктатуру пралетарыяту. II Інтэрнацыянал (1889—1914), у сваю пешую пару выконваўшы карысную работу падрыхтоўкі глебы для пашырэньня масавага рабочага руху, ня здолеў ні паставіць, ні тым больш вырашыць гэтыя задачы. Апартуністы, які ўзрос у абстаноўцы параўнальна «мірнага» разьвіцьця, выгадзеван легальнасьцю, апіраўся на рабочую арыстакратыю, фактычна панаваў у даваенным II Інтэрнацыянале. Тыпам партыі II Інтэрнацыяналу «была партыя, якая цярпела ў сваім асяродзішчы апартунізм... Гэты тып перажыў сябе» (Ленін, т. XVIII, стар. 86).

Для вырашэньня вялізарнейшых задач новай эпохі—эпохі імпэрыялізму і пралетарскай рэвалюцыі—рабочай кляса была неабходна ПАРТЫЯ НОВАГА ТЫПУ. Гэта партыя была створана геніяльным правадыром і тэарэтыкам бальшавізму—ЛЕНІНЫМ.

4. РАСІЯ была вузлавым пунктам усіх супярэчнасьцяй імпэрыялізму; ачагом нябывалага капіталістычнага, памешчыцкага, капіяліяльнага і ваенна га ўціску; важнейшым рэзервам і агентурай заходняга імпэрыялізму ў барацьбе супроць рэвалюцыі і ў драпежніцкай эксплёатацыі дзесяткаў мільёнаў рабочых, сялян і калёніяльных рабоў. Інтарэсы царызму і заходняга імпэрыялізму шчыльнейшым чынам перапляталіся паміж сабой.

Усё гэта вызначыла характар, сваяасаблівасьць і міжнароднае значэньне нарастаўшай у Расіі найвялікшай народнай рэвалюцыі, на чале якой ішоў рэвалюцыйны пралетарыят, вядучы за сабой шматмільённыя сялянскія масы, якія ўзьнімаліся супроць памешчыка. «Рэвалюцыя супроць царызму зблізалася, такім чынам, і павінна была ПЕРАРАСЬЦІ ў рэвалюцыю супроць імпэрыялізму, у рэвалюцыю пралетарскую» (СТАЛІН, «Вопросы ленинизма», стар. 9). Яшчэ да II зьезду, у 1902 годзе, Ленін пісаў: «Гісторыя паставіла цяпер перад намі бліжэйшую задачу, якая зьяўляецца НАЙБОЛЬШ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ з усіх БЛІЖЭЙШЫХ задач пралетарыяту якой-бы там ні было іншай краіны. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы, зруйнаваньне самага мацнага апору ня толькі эўрапэйскай, але таксама (можам мы сказаць цяпер) і азіяцкай рэакцыі зрабіла-б расіі пралетарыят авангардам міжнароднага рэвалюцыйнага пралетарыяту» (ЛЕНІН, т. IV, стар. 382).

Цэнтр сусьветнага рэвалюцыйнага руху перамясьціўся ў Расію. РАСІЯ СТАЛА БАЦЬКАЎШЧЫНАЙ ЛЕНІНІЗМУ, БАЦЬКАЎШЧЫНАЙ БАЯВОЙ ПАРТЫІ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

5. Афармленьне бальшавізму на II зьезьдзе РСДРП—рэзультат усёй папярэдняй ДЗЕСЯЦІГАДОВАЙ БАРАЦЬБЫ ЛЕНІНА ЗА РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ ПАРТЫЮ. Яшчэ ў 90-х гадох Ленін выступіў як непасрэдны, адзіны і да канца пасьлядоўны пераемнік і прадаўжальнік справы Маркса і Энгельса.

«Бальшавізм узьнік у 1903 годзе на самай моцнай базе тэорыі марксызму». «Марксызм, як адзіна правільную, рэвалюцыйную тэорыю, Расія сапраўды ВЫПАКУТАВАЛА поўвекавой гісторыяй нячуваных пакут і ахвяр, нячуванага рэвалюцыйнага гераізму, нязвычайнай энэргіі і самаахвярнасьці шуканьняў, навучаньня, выпрабаваньня на практыцы, расчараваньняў, праверкі, супастаўленьня вопыту Эўропы» (ЛЕНІН, т. XXV, стар. 175). Такі поўвекавы шлях рэвалюцыйнага руху ў Расіі да 90-х гадоў.

Група «Освобождение труда» (заснаваная ў 1883 г.) на чале з Плеханавым —першая сацыял-дэмакратычная арганізацыя ў Расіі — «толькі тэарэтычна заснавала сацыял-дэмакратыю і зрабіла першы крок насустрач рабочаму руху» (ЛЕНІН, т. XVII, стар. 353). Іменна Ленін ужо ў сваіх першых выступленьнях, у 1894 г., з усёй сілай высунуў перад рэвалюцыйным пралетарыятам нашай краіны вялікую задачу, сфармуляваную ім у надзвычайнай рабоце «Что такое друзья народа»: «Рускі РАБОЧЫ, узьняўшыся на чале ўсіх дэмакратычных элемэнтаў, звяліць абсалютызм і павядзе РУСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ (побач з пралетарыятам УСІХ КРАІН) ПРОСТАЙ ДАРОГАЙ АД КРЫТАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ БАРАЦЬБЫ ДА ПЕРАМОЖНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ» (Ленін, т. I, стар. 194).

Ужо ў 90-х гадох Ленін разгарнуў самую непрымірымую барацьбу супроць народніцтва, супроць рэвізіяністаў расійскіх (струвісты, эканамісты) і заходня-эўрапэйскіх (бэрнштэйніянцы). Ужо ў 90-х гадох Ленін распрацоўваў далей марксызм ва ўсіх галінах, няўхільна абараняў і праводзіў прынцып партыйнасьці тэорыі і непарыўнага адзінства рэвалюцыйнай тэорыі і рэвалюцыйнай практыкі. Ленінскія работы 90-х гадоў—пачатак ленінскага этапу ў разьвіцьці марксызму.

Ужо ў 90-х гадох Ленін паставіў задачу стварэньня пралетарскай партыі новага тыпу. Ужо тады Ленін разгарнуў рашучую барацьбу за баявую, ваюючую партыю камуністычнай рэвалюцыі. «Гісторыя сацыялізму і дэмакратыі ў Заходняй Эўропе, гісторыя рускага рэвалюцыйнага руху, вопыт нашага рабочага руху,—такі той МАТАР'ЯЛ, якім мы павінны аўладаць, каб выпрацаваць мэтазгодную арганізацыю і тактыку нашай партыі... «Апрацоўка» гэтага матар'ялу павінна быць, аднак, самастойная, бо гатовых узораў нем шукаць няма дзе» (ЛЕНІН, т. II, стар. 497).

Створаны і кіруемы Леніным пецярбурскі «СОЮЗ БОРЬБЫ ЗА ОСВОБОЖДЕНИЕ РАБОЧЕГО КЛАССА» (1895—1897) быў зачаткам бальшавіцкай партыі. У «Союзе борьбы» Ленін непрымірыма ваяваў супроць малейшых праяўленьняў апартунізму, кіраваў першымі рэвалюцыйнымі схваткамі пралетарыяту і выхоўваў рабочую клясу для рашаючай атакі супроць самаўладатва і буржуазіі. У гэтай барацьбе Ленін выхаваў і згуртаваў цесную групу сваіх аднадумцаў і балявых паплечнікаў, будаўнікоў бальшавіцкай партыі.

«БАЛЬШАВІКІ НЯ «КАЗУС»,—ЯНЫ ВЫРАСЬЛІ З БАРАЦЬБЫ З АПАРТУНІЗМАМ 1894—1914 гг.» (Ленінскі зборнік XIV, стар. 317).

6. II зьезд быў непасрэдна падрыхтован барацьбой за партыю, барацьбой супроць расійскага і міжнароднага апартунізму, якую вяла створаная і кіруемая Леніным старая «ІСКРА» (1900-1903).

I зьезд РСДРП (сакавік 1898 г.) абвясьціў стварэньне партыі. Але рух папярэдняму заставаўся на стадыі асобных, разрозьненных гурткоў, ня зьвязаных адзінствам баявой праграмы і цэнтралізаванай арганізацыі. С.-Д. групы і гурткі разьядналіся іржаўчынай ЭКАНАМІЗМУ. «Эканамісты» — расійская рознавіднасьць міжнароднага апартунізму, агентура буржуазіі ў рабочым руху — адмаўлялі ролю рэвалюцыйнай тэорыі, пракланяліся перад стыхійнасьцю, адмаўлялі гегемонію пралетарыяту і неабходнасьць рэвалюцыйнай партыі. «Эканамісты» адмаўлялі самастойную палітычную ролю рабочай клясы, цягнуліся ў хвасьце адсталых пластоў рабочых, займаліся крохаборствам і зьвужвалі задачы рабочай клясы да «барацьбы за пятачок», пагарджаючы канчатковай мэтай рабочага руху, ператвараючы рабочую клясу ў хвосьце буржуазіі («рабочым —эканамічная, лібэралам — палітычная барацьба»). Бязьпітасная барацьба з эканамізмам была пытаньнем жыцьця і сьмерці для партыі. Ленін узначаліў гэту барацьбу яшчэ ў пецярбурскім «Саюзе» (1895—1897) і ў сібірскай ссылцы (1897-1899).

У барацьбе з эканамізмам, у абстаноўцы ідэйнага разбоду і арганізацыйнага саматужніцтва Ленін разгарнуў свой гістарычны ПЛЯН БУДАЎНІЦТВА ПАРТЫІ («што рабіць?»). Асноўным зьвяном гэтага плану было стварэньне агульнарускай палітычнай ГАЗЭТЫ, якая павінна была стаць ідэйным і арганізацыйным цэнтрам балявога ядра прафэсыянальных рэвалюцыянэраў дысцыплінаванага і цэнтралізаванага выступаючага ва ўсеузбраеньні марксыцкай праграмы і тактыкі, бязьпітасна выганяючага са сваіх радоў апартуністычныя элемэнты, цесна зьвязанага з рабочымі масамі, пабудаванага на рэвалюцыйнай сьвядомасьці і найвялікшай ак тыўнасьці кожнага ўдзельніка. «Перамога гэтага пляну зкладна фундамент тэй згуртаванай і загартаванай камуністычнай партыі, роўнай якой ня ведае сьвет» (СТАЛІН «О Ленине», Партвыдат, 1932 г., стар. 7).

«

Пастановы ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦККК КП(б)Б

Трыццаць год бальшавіцкай партыі (1903–1933)

Сваю лінію на разрыў, на раскол з апартуністамі і цэнтрыстамі бальшавікі праводзілі і ў расійскім і ва ўсім МІЖНАРОДНЫМ рабочым руху. Вось чаму правадыры дваяснага II Інтэрнацыяналу ўпарта змагаліся супроць бальшавікоў, стараючыся пад сьцягам «прымірэньня варожых фракцый» ліквідаваць бальшавіцкую партыю. Усёй сваёй рашучай і бязьлітаснай барацьбой з апартунізмам і цэнтрызмам бальшавікі аказвалі найвялікшае падтрыманьне ЛЕВЫМ С.-Д. НА ЗАХАДЗЕ і, рашуча крытыкуючы іх поўменшавіцкія памылкі, іх непасьлядоўнасьць у барацьбе з апартунізмам, іх боязнь расколу, згуртоўвалі іх на ідэйнай аснове ленінізму. Бальшавіцкая барацьба супроць апартуністаў і цэнтрыстаў зьяўлялася ўзорам палітыкі для ўсяго левага крыла міжнароднага рабочага руху.

Імпэрыялістычная вайна 1914—1918 г. г. была суровай і бязьлітаснай праверкай усіх плыняў у рабочым руху. II Інтэрнацыянал абанкрутаваў, абясьсілены і пераможаны апартунізмам. Бальшавікі былі адзінай партыяй, якая выканала свой абавязак перад міжнародным пралетарыятам да канца. У барацьбе супроць расійскага і міжнароднага рэфармізму, сацыял-шавінізму і казуістыкі, перамагаючы непасьлядоўнасьць левых с.-д. на Захадзе «БАЛЬШАВІЗМ СТВАРЫЎ ІД�эЙНЫЯ І ТАКТЫЧНЫЯ АСНОВЫ III ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ» (ЛЕНІН, т. XXIII, стар. 385).

12. Лютаўская рэвалюцыя 1917 году была бліскучым пацьвярджэньнем пёзункгаў і ідэй бальшавізму. Зьвяржэньне царызму адкрывае ДРУГІ ЭТАП у гісторыі партыі (сакавік — кастрычнік 1917 г.). Партыя ставіць на чаргу барацьбу за ажыцьцяўленьне другога стратэгічнага пляну, аб якім Ленін пісаў яшчэ ў 1905 годзе: «ПРАЛЕТАРЫЯТ ПАВІНЕН ЗРАБІЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ПЕРАВАРОТ, ДАЛУЧАЮЧЫ ДА СЯБЕ МАСУ ПОЎПРАЛЕТАРСКІХ ЭЛЕМЭНТАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА, КАБ ЗЛАМАЦЬ СІЛАЙ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ БУРЖУАЗІІ І ПАРАЛІЖАВАЦЬ НЯЎСТОЙЛІВАСЬЦЬ СЯЛЯНСТВА І ДРОБНАЙ БУРЖУАЗІІ» (ЛЕНІН, т. VIII, стар. 96).

ПАРТЫЯ Ў ЭПОХУ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ

13. Кастрычніцкая рэвалюцыя ўстанавіла на адзэй шостай частцы зямной кулі дыктатуру пралетарыяту, і тым самым пераварыла ў жыцьцё цэнтральную ідэю праграмы, прынятай II зьездам. Кастрычніцкая перамога «знамянуе сабой нямінучую перамогу ленінізму над сацыял-дэмакратызмам у сусьветным рабочым руху. Эра панаваньня II Інтэрнацыяналу і сацыял-дэмакратызму ў рабочым руху СКОНЧЫЛАСЯ. НАСТУПІЛА эра панаваньня ленінізму і III Інтэрнацыяналу» (Сталін, «Аб Кастрычніцкай рэвалюцыі», ст. 136.)

З партыі, якая змагаецца за ўладу, наша партыя 25-га кастрычніка 1917 году ператварылася ў правячую партыю, асноўную кіруючую сілу ў сыстэме дыктатуры пралетарыяту. Пачаўся ТРЭЦІ ЭТАП у гісторыі нашай партыі. Стратэгічны план Леніна: правесьці «максімум ажыцьцявімага ў адзэй краіне для разьвіцьця, падтрыманьня, прабуджэньня рэвалюцый ВА ЎСІХ краінах» (Ленін, т. XXIII, стар. 385); «умацаваць дыктатуру пралетарыяту ў адзэй краіне, скарыстоўваючы яе як апорны пункт для зьвяржэньня імпэрыялізму ва ўсіх краінах» (Сталін, «Вопросы ленинизма», стар. 54). Пад геніяльным кіраўніцтвам ЛЕНІНА партыя цьвёрда праводзіла гэты вялікі плян. Выходны пункт гэтага пляну — вучэньне Леніна аб магчымасьці перамогі сацыялізму ў адзэй, асобна ўзятай краіне.

Партыя змагалася за гэты плян у гады ВАЕННАГА КАМУНІЗМУ (1918—1920), абараняўшы дыктатуру пралетарыяту ў баёх з замежнай і ўнутранай контр-рэвалюцыяй. Гэты плян партыя пакласла ў аснову НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ, пры пераходзе да якой Ленін абвясьціў (1921), што «зараз галоўнае сваё ўзьдзеяньне на міжнародную рэвалюцыю мы аказваем сваёй гаспадарчай палітыкай» (ЛЕНІН, т. XXVI, стар. 410). Ленін паставіў перад партыяй задачу: ПАБУДАВАЦЬ ФУНДАМАНТ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ, ЗЬНІЧШЫЦЬ КЛАСЫ, ПЕРАТВАРЫЦЬ РАСІЮ НЭПАЎСКУЮ Ў РАСІЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ.

На чале са СТАЛІНЫМ, вялікім прадаўжальнікам Леніна, партыя пераможна ВЫРАШЫЛА гэту сусьветна-гістарычную задачу.

14. У эпоху дыктатуры пралетарыяту непамерна вырастае значэньне БАРАЦЬБЫ ЗА ПАРТЫЮ, ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ ПАРТЫЙНАСЬЦЬ. «Дыктатура пралетарыяту — ёсьць упартая барацьба, крывавая і бескроўная, гвалтоўная і мірная, ваенная і гаспадарчая, педагагічная і адміністрацкая — супроць сіл і традыцый старога грамадзтва. Сіла прывычкі мільёнаў і дзесяткаў мільёнаў — самая страшная сіла. Без партыі, жалезнай і загартаванай у барацьбе, без партыі, якая карыстаецца даверам усяго сумленнага ў данай кляссе, без партыі, якая ўмее сачыць за настроем масы і рабіць уплыў на яго, весьці з посьпехам такую барацьбу немагчыма» (ЛЕНІН, т. XXV, стар. 191).

УСЯ гісторыя ўнутрыпартыйнай барацьбы пасьля Кастрычніка сьведчыць об тым, што спробы падрыву партыйнага адзінства і дысцыпліны зьяўляюцца простым дапаможнікам растаўратарскім спробам буржуазіі. УСЯ барацьба апартуністаў супроць партыі была і застаецца нічым іншым, як СПРОБАЙ навязаць партыі Леніна гнілыя традыцыі і догмы II Інтэрнацыяналу, спробай адрадзіць меншавізм.

Нічым іншым, як спробай адрадзіць меншавізм, была пазыцыя ПРАВЫХ апартуністаў і лікідатараў Кастрычніка (Каменеў, Зіноўеў, Рыкаў, Шляпнікаў).

ТРАЦКІЗМ, які ўпарта аднаўляў атакі супроць партыі і ў 1916, і ў 1921 годзе, і ў 1923—1927 г. г., арганізаваў антыпартыйных блёкаў, закляты вораг ленінізму і бальшавіцкай партыйнасьці, нямінуча ператварыўся ў перадавы атрад буржуазнай контр-рэвалюцыі.

«ЛЕВЫЯ КАМУНІСТЫ» (Бухарын, Эрэфражэнскі) у сваёй авантурніцкай раскольніцкай палітыцы дажаліся да практычнага саюзу з левымі эсэрамі супроць Леніна.

ФРАКЦЫЯ «ДЭМАКРАТЫЧНАГА ЦЭНТРАЛІЗМУ» (Сапронаў) спаўзла ў контр-рэвалюцыйнае меншавіцкае балота.

«РАБОЧАЯ АПАЗЫЦЫЯ» (Шляпнікаў) з анарха-сындыкалісцкага ўхілу вырадзілася ў кучку злобствуючых трэцкістскіх рэнегатаў.

«НОВАЯ АПАЗЫЦЫЯ» (Зіноўеў, Каменеў) ганебна скацілася да трацкізму, у рады антыпартыйнага і антысавецкага блёку.

ПРАВАЯ АПАЗЫЦЫЯ (Бухарын, Рыкаў, Томскі) адпюстроўвала супраціўленьне контр-рэвалюцыйнага кулацтва, перавала з асновамі марксызму-ленінізму і расчышчала шлях для буржуазнай рэстаўрацыі.

ПРАВА-«ЛЯВАЦКІ» БЛЁК (Сырцоў, Ламінадзэ) прабаваў дэзарганізаваць партыю пры дапамозе атручанай зброі двурушніцтва.

НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫЯ ГРУПОЎКІ, пачаўшы з барацьбы супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі і нязьменна прымыкаўшыя да кожнай зноў узьнікаўшай антыпартыйнай фракцыі, на справе аказаліся дапаможнікамі і зброяй міжнароднага імпэрыялізму.

Прадуктам РАЗЛАЖЭНЬНЯ РАЗГРОМ ЛЕНЬІХ ПАРТЫЙЯ ГРУПОВАК былі мізэрныя антысавецкія групкі Руціна — Сыпягова — Угланава і Зясмонта — Талмачова — Сьмірнова.

АГУЛЬНАЙ рысай УСІХ антыпартыйных плыняй зьяўляецца меншавіцкае адмаўленьне сацыялістычнага характару нашай рэвалюцыі, адмаўленьне дыктатуры пралетарыяту, адмаўленьне магчымасьці перамогі сацыялізму ў адзэй краіне і курсу нашай партыі на сусьветную рэвалюцыю, меншавіцкая капітуляцыя перад клясовым ворагам, агіда да клясавай барацьбы з усімі яе труднасьцямі, хвасьвіцкае прыніжэньне гістарычнай ролі пралетарыяту, як правадыра і арганізатара сацыялістычнага будаўніцтва, панска-анархічны пратэст супроць пралетарскай дысцыпліны нашай партыі і савецкай дзяржавы, імкненьне падарваць бальшавіцкі цэнтралізм, разьвянчаць ленінскія кадры партыі і яе старую гвардыю, скінуць яе кіраўніцтва.

У сваіх нападках на ленінскі ЦК УСЕ яны нязьменна цьвердзяць меншавіцкія зады аб «заціску» і «партыйным бюракратызьме». «Крыкі аб спавутым бюракратызьме, — пісаў Ленін яшчэ ў 1904 г., — ёсьць простая адкрытае нездавальненьне асабістым складам цэнтраў, ёсьць фігавы лісток, скрашваючы парушэньне слова, урачыста данага на зьезьдзе. Ты бюракрат, бо ты назначан зьездам на эгоіна маёй волі, а наперакор ёй; ты фармаліст, бо ты апіраешся на фармальныя пастановы зьезду, а не на маю згоду; ... ты самаўладца, бо ня хочаш аддаць уладу ў рукі старой, цёплай кампаніі» (ЛЕНІН, т. VI, стар. 287).

На працягу апошніх дзесяці год, у сілу рашаючага характару баёў, зьвязаных з падрыхтоўкай і разгортваньнем сацыялістычнага наступленьня, унутрыпартыйная барацьба набыла ВЫКЛЮЧНУЮ ВОСТРАСЬЦЬ. Пасьлядоўна ажыцьцяўляючы ленінскія заветы, партыя, кіруемая Сталіным, разграміла трацкізм і правую апазыцыю. Партыя выкрыла «левых» загібшчыкаў, як адрыжку контр-рэвалюцыйнага трацкізму, і паказала, што яны зьяўляюцца аб'ектыўна саюзьнікамі правых ухілістаў.

За гэтыя гады рабочая кляса нашай краіны гіганцкі вырасла, набыла вялізарны палітычны вопыт, яшчэ цясьней згуртавалася вакол партыі і яе ЦК. Ва ўсёй сваёй барацьбе з апартунізмам, з рэцыдывамі контр-рэвалюцыйнага меншавізму, партыя сустракае актыўнейшае падтрыманьне самых шырокіх мас рабочай клясы. Партыя працягвае ГРАМІЦЬ АПАРТУНІСТАЎ, ДВУРУШНІКАЎ, ПЕРАРАДЖЭНЦАЎ, — усіх тых, хто на словах прызнае генэральную лінію партыі, дырэктывы ЦК і дзяржаўныя плянавыя заданьні, а на справе іх сабатуе і зрывае; усіх, хто не жадае змагацца з клясавым ворагам, падтрымлівае антыдзяржаўныя тэндэнцыі, парушае жалезную дысцыпліну партыі і дзяржавы, расхістае рэвалюцыйную законнасьць; усіх, хто патурае бюракратычна-канцылярскім мэтадам кіраўніцтва, пагаджае патрабамі рабочых і калгасьнікаў, падмяняе выхаваньне, пераконваньне і арганізацыю мас голым адміністраваньнем. УсеКП(б) ідзе да новых перамог, змагаючыся НА ДВА ФРОНТЫ, супроць правага апартунізму, як ГАЛОЎНАЙ небясьпекі на даным этапе, і супроць «левага» апартунізму. Партыя вядзе рашучую барацьбу супроць ухілаў да мясцовага нацыяналізму і вялікарускага шавінізму, які прадстаўляе ў маштабе СССР галоўную небясьпеку ў галіне нацыянальнага пытаньня. Партыя адмятае проч гнілы лібералізм і прымірэнцтва. «ПРЫНЦЫПЫ НЕ «ПРЫМІРАЮЦЦА», А ПЕРАМАГАЮЦЬ» (Сталін, «Национальный вопрос и марксизм». СПБ. «Прибой», 1914 г., стар. 80).

15. У трыццацігадовай барацьбе з ворагамі УсеКП(б) выкавала сваё ленінскае адзінства. З падпольных гурткоў яна вырасла ў магутную сілу, зьвязаную пры дапамозе разгалінаваных масавых арганізацый (прафсаюзы, саветы, кааперацыя, Чырвоная армія, камсамол, жаночыя дэлегацкія сходы і інш.) з дзесяткамі мільёнаў рабочых і сялян, ідучых за партыяй. На кожным этапе барацьбы партыя, праяўляючы вялізарнейшую гібкасьць, сьмела перабудоўвае арганізацыйныя формы сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі.

Высунуўшы задачу ПА-НОВАМУ ПРАЦАВАЦЬ — ПА-НОВАМУ КІРАВАЦЬ, партыя дапаўняе тэрытарыяльную форму пабудовы партарганізацый ВЫТВОРЧАЙ формай. Прадпрынятая па ініцыятыве Сталіна перабудова ўсёй партыйнай работы прыстасоўна да ўмоў пэрыяду сацыялізму зьяўляецца буйнейшым крокам у далейшым РАЗЬВІЦЬЦІ ЛЕНІНСКІХ ПРЫНЦЫПАЎ ПАБУДОВЫ ПАРТЫІ НОВАГА ТЫПУ.

Стваючы ПАЛІТАДДЗЕЛЫ МТС і саўгасаў і калгасныя вытворчыя ячэйкі, арганізуючы ПАЛІТАДДЗЕЛЫ на транспарце і ўводзячы новыя формы работы ў прамысловасьці (у першую чаргу па вугалі і мэталю), партыя павышае сваю баяздольнасьць, узьнімаа на новую ступень канкрэтнасьць і эфэктыўнасьць свайго кіраўніцтва, умацоўвае сваю бальшавіцкую дысцыпліну, сваю цэнтралізаваную магутнасьць. У вёсцы, куды ЦК накіраваў буйны атрад праверэных партыйных работнікаў, палітаддзелы МТС і саўгасаў ужо пераўтварыліся ў важнейшыя вагары арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, заваяваньня большасьці ў калгасах і саўгасах, забесьпячэньня ў іх бальшавіцкага кіраўніцтва. Усялякія спробам сарваць работу палітаддзелаў, прынізіць іх значэньне, перашкодзіць умацаваньню бальшавіцкага цэнтралізму наша партыя дае сакрушальны адпор. «Цэнтралізм, — гаварыў Ленін на II зьезьдзе, — патрабуе АДСУТНАСЬЦІ ўсякіх перагародак паміж цэнтрам і самымі аддаленымі, самымі захапускімі часткамі партыі» (ЛЕНІН, т. VI, стар. 19).

УсеКП(б) бязьлітасна змагаецца з апартуністычнымі тэорыямі «растварэньня» партыі ў працоўных масах, усё вышэй і вышэй узьнімаючы званьне члена бальшавіцкай партыі. Партыя ўцягвае ў свае рады сотні тысяч перадавых пралетараў, захоўваючы ў сіле «выпрабаваны мэтад ІНДЫВІДУАЛЬНАГА падыходу да кожнага, хто жадае ўступіць у партыю, і ІНДЫВІДУАЛЬНАГА прыёму ў партыю. Нам патрэбна ня толькі колькасьць, але і якасьць» (Сталін, «Пытаньні сьвядлоўцаў і адказы т. Сталіна», «Правда», № 40 ад 10-II 1930 г.).

Партыя атрымала свае вялізарнейшыя перамогі, бо ніколі не зазнавалася, не прабавала пачыць на лаўрах. «Самакрытыка бязумоўна неабходна для ўсякай жывой і жыцьцёвай партыі. Няма нічога пашлей самазадаволенага аптымізму» (Ленінск. зборнік, V, стар. 308). БЕЗ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ НЯМА БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫЙНАСЬЦІ. Лёзунг самакрытыкі «ляжыць у самой аснове бальшавіцкай партыі», «ляжыць у аснове рэжыму дыктатуры пралетарыяту» (СТАЛІН «О работах апрельского об'единенного пленума ЦК и ЦКК», стар 5, выд. 1928 г.).

Вышэйшым праяўленьнем бальшавіцкай самакрытыкі зьяўляецца ПАРТЫЙНАЯ ЧЫСТКА. УсеКП(б) праводзіць чыстку сваіх радоў такім чынам, каб «забясьпечыць у партыі жалезную пралетарскую дысцыпліну і ачышчэньне партыйных радоў ад усіх ненадзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элемэнтаў» (пастан. ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі, «Правда», № 118, ад 29-IV 1933 г.).

16. У трыццацігадовай барацьбе з апартунізмам бальшавіцкая партыя выкавала свае баявыя традыцыі. «У сьвеце няма і ня бывала такой магутнай і аўтарытэтнай партыі, як наша камуністычная партыя» (СТАЛІН «О работе в деревне», Партвыдат. 1933 г., стар. 14).

На ўсім працягу свайго гістарычнага шляху наша партыя дзейнічала, як АДЗІНАЯ маналітная сіла, нязьменна сьледуючы прынцыпу, агалошанаму Леніным на II зьезьдзе: «Усякі член партыі адказны за партыю і ПАРТЫЯ АДКАЗНА ЗА ЎСЯКАГА ЧЛЕНА» (ЛЕНІН, т. VI, стар. 33). У кязьлічных баёх з клясавымі ворагамі і іх агентурай, УсеКП(б) зьяўляла не вялізарную вышыню ВЯЛІКАЕ ЗВАНЬНЕ ЧЛЕНА ПАРТЫІ.

На ўсіх этапах барацьбы, на ўсіх участках клясавага фронту ЧЛЕН БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ — нязьменна з масамі, на чале мас, ідучы наперарэз адсталым настроям, цярпліва пераконваючы масы на іх уласным вопыце ў правільнасьці лініі партыі.

У гады царызму ЧЛЕН БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ з глыбокага падпольля ўзьнімае масы на барацьбу супроць прыгоньніку — памешчыку і буржуазіі. Ён — на чале паўстаўшых рабочых, узьняўшых у Кастрычніку сьцяг пралетарскай дыктатуры. Ён — у першых радах рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, яе радавы баец, камандзір, камісар. На ўсіх франтох, дзе вырашаўся лёс рэвалюцыі, ён — узор пралетарскай вытрыманасьці і гераізму.

ЧЛЕН БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ вядзе масы на ўпартую барацьбу з голадам, хопадам і разрухай у гады грамадзянскай вайны; ён запальвае працоўны энтузіязм мільёнаў, што змагаюцца за аднаўленьне і сацыялістычную рэканструкцыю народнай гаспадаркі; ён — застрэльшчык сацпаборніцтва, даючы ўзоры ўдарнай працы і бальшавіцкіх тэмпаў; ён — перадавы баец на будоўлі гігантаў сацыялістычнай індустрыі і ў справе асваеньня навейшай тахнікі.

ЧЛЕН БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ мацуе змычку рабочай клясы з сялянствам; узьнімае сялянскія масы супроць кулацкай кабалы, вядзе іх на адкрыты бой за зьнішчэньне кулацтва як клясы, за сацыялістычную пераробку вёскі; дапамагае калгаснаму сялянству зьмяцаць яго дробна-ўласьніцкія забабоны; змагаецца за трактар, камбайн і аўтамабіль на калгасных і саўгасных палёх.

ЧЛЕН БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ будуе і ўмацоўвае дзяржаву пралетарскай дыктатуры, узьнімае яросьць мас супроць коснасьці і бюракратызму; ён заўсёды на варце ў барацьбе супроць адкрытых і скрытых ворагаў савецкай дзяржавы, супроць подыра, жуліка, расхрадзальніка сьвяшчэннай сацыялістычнай уласнасьці, супроць шкодніка, шпіёна. Ён не шкадуе сіл для павышэньня ваеннай магутнасьці рабоча-сялянскай краіны.

ЧЛЕН БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ няўхільна змагаецца за пралетарскі інтэрнацыяналізм, за цеснае супрацоўніцтва народаў СССР і народаў усяго сьвету. Член вядучай партыі Камуністычнага Інтэрнацыяналу, — ён усёй сваёй работай, усёй сваёй барацьбой служыць справе сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

ЧЛЕН БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ — дысцыплінаваны баец, непримірымы ленінец, заўсёды гатовы даць адпор адкрытым і скрытым ворагам сваёй партыі, заўсёды і ўсюды захоўваючы самавахвярную адданасьць свайму ленінскаму ЦК.

«МЫ, КАМУНІСТЫ, — ЛЮДЗІ АСАБЛІВАГА СКЛАДУ, МЫ СКРОЕНЫ З АСОБНАГА МАТАР'ЯЛУ. МЫ — ТЫЯ, ЯКІЯ СКЛАДАЮЦЬ АРМІЮ ВЯЛІКАГА ПРАЛЕТАРСКАГА СТРАТЭГА, АРМІЮ ВЯЛІКАГА ЛЕНІНА. НЯМА НІЧОГА ВЫШЭЙ, ЯК ГОНАР НАЛЕЖАЦЬ ДА ГЭТАЙ АРМІІ. НЯМА НІЧОГА ВЫШЭЙ, ЯК ЗВАНЬНЕ ЧЛЕНА ПАРТЫІ, ЗАСНАВАЛЬНІКАМ І КІРАЎНІКОМ ЯКОЙ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ТАВ. ЛЕНІН. НЯ ЎСЯКАМУ ДАНО БЫЦЬ ЧЛЕНАМ ГЭТАЙ ПАРТЫІ. НЯ ЎСЯКАМУ ДАНО ВЫТРЫМАЦЬ НЯГОДЫ І БУРЫ, ЗЬВЯЗАНЫЯ З ЧЛЕНСТВАМ У ТАКОЙ ПАРТЫІ. СЫНЫ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ, СЫНЫ ГАЛЕЧЫ І БАРАЦЬБЫ, СЫНЫ НЯЗЬМЕРНЫХ ПАКУТ І ГЕРАІЧНЫХ НАМАГАНЬНЯЎ — ВОСЬ ХТО, ПЕРШ ЗА ЎСЁ, ПАВІННЫ БЫЦЬ ЧЛЕНАМІ ТАКОЙ ПАРТЫІ» (СТАЛІН, прамова на II зьезьдзе саветаў, «Правда», № 23 ад 30-I 1924 г.).

17. УсеКП(б) — авангард КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ.

Яшчэ на старонках старой «Искры» Ленін прадракаў нямінучы разрыў рэвалюцыйнай «Горы» і апартуністычнай «Жиронды» ў сусьветным рабочым руху. З тых часоў II Інтэрнацыянал даўно ператварыўся ў галоўную сацыяльную апору буржуазнай дыктатуры. Яго зьдрад ніцкія правадыры пракладваюць дарогу фашызму. Лёс германскай сацыял-дэмакратыі, якая поўзае перад Гітлерам, сьведчыць аб усёй глыбіні ўпаду міжнароднага меншавізму.

Партыям II Інтэрнацыяналу, якія разлагаюцца, процістаяць ва ўсіх краінах капіталістычнага ЗАХАДУ І ЎСХОДУ баяздольныя і самахвярныя атрады перадавых пралетараў-бальшавікоў, якія згуртаваліся пад сьцягам заснаванага Леніным Камінтэрну. Усяабдзеючы 30-гадовы вопыт бальшавізму, рашы брацкія кампартыі, — і ў іх першых гадох спаўзнуе камуністычная партыя Германіі, — будуюць свае ячэйкі на прадпрыемствах, выхоўваюць кадры сваіх прафэсыянальных рэвалюцыянераў, вучацца спалучаць легальныя і нелегальныя формы работы. Па прыкладзе ленінскай УсеКП(б) брацкія партыі вядуць непримірымую барацьбу на два фронты супроць апартуністаў, бязьлітасна выганяюць са сваіх радоў правых ліквідатараў і «левых» сэктантаў.

Сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне — РАШАЮЧЫ вучастак міжнароднага пралетарскага фронту. Пралетарыят СССР — рэвалюцыйнайшы атрад інтэрнацыянальнай рабочай клясы. «Руская рэвалюцыя была (і застаецца) вузлавым пунктам сусьветнай рэвалюцыі; ... карэнныя пытаньні рускай рэвалюцыі зьяўляліся разам з тым (і зьяўляюцца цяпер) карэннымі пытаньнямі сусьветнай рэвалюцыі», (СТАЛІН «Вопросы ленинизма», стар. 610). Камінтэрн апіраецца ў сваёй барацьбе на найвялікшыя перамогі нашай партыі.

Бальшавізм — «УЗОР ТАКТЫКІ ДЛЯ ЎСІХ» (Ленін). Сьледуючы гэтаму ўзору, камуністычныя партыі ўсіх краін пад сьцягам Леніна і Сталіна рыхтуюцца да рашаючых баёў новага туру рэвалюцый і войнаў, гераічна змагаюцца супроць фашызму і сацыял-дэмакратыі, за большасьць рабочай клясы, за СССР — бацькаўшчыну ўсіх працоўных, за перамогу дыктатуры пралетарыяту ва ўсім сьвеце. Узброеныя марксыцка-ленінскім вучэньнем, камуністы ўсяго сьвету будуюць і ўмацоўваюць СУСЬВЕТНУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ПАРТЫЮ. Камуністычны Інтэрнацыянал увасабляе перамогу ленінізму, перамогу прынцыпаў бальшавіцкай партыйнасьці і непримірымай рэвалюцыйнасьці ў міжнародным рабочым руху.

«ЛЕНІНІЗМ ЁСЬЦЬ ЦЭЛЬНАЯ ТЭОРЫЯ, УЗЬНІКШАЯ Ў 1903 Г., ЯКАЯ ПРАЙШЛА ВЫПРАБАВАНЬНЕ ТРОХ РЭВАЛЮЦЫЙ І ІДЗЕ ЦЯПЕР НАПЕРАД, ЯК БАЯВЫ СЬЦЯГ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ» (СТАЛІН «Об Октябрьской революции», стар. 71).

***

Трыццаць год таму назад на II зьезьдзе РСДРП Ленін указаў шлях барацьбы рабочай клясы. Трыццаць год таму назад Ленін даў пралетарыяту непераўкальную ЗБРОЮ, без якой быў немысьлімы пасьпяховы рух па гэтым шляху, — баявую, дысцыплінаваную, цэнтралізаваную ПАРТЫЮ, якая ўладае самай перадавой рэвалюцыйнай тэорыяй. За гэтыя трыццаць год бальшавіцкая партыя няўхільна ішла па шляху Леніна і дабілася на гэтым шляху перамог, адкрыўшых новую эпоху ў гісторыі чалавецтва. Па гэтым шляху бальшавіцкая партыя пад кіраўніцтвам Сталіна пойдзе далей, да новых перамог камунізму. «ПАРТЫЯ НЕПЕРАМОЖНА, КАЛІ ЯНА ВЕДАЕ, КУДЫ ВЕСЬЦІ СПРАВУ, І НЕ БАІЦЦА ТРУДНАСЬЦЯЎ» (Сталін).

ІНСТЫТУТ МАРКСА — ЭНГЕЛЬСА — ЛЕНІНА ПРЫ ЦК УсеКП(б).

Аб выніках сяўбы, правядзеньні ўборкі і малацьбе

Пастанова VII аб'яднанага пленуму ЦК і ЦККК КП(б)Б

Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б адзначае, што па БССР веснавая сяўба закончана ў гэтым годзе значна з большым посьпехам, чым у мінулым годзе як па тэрмінах, так і па якасьці апрацоўкі палёў.

План веснавой сяўбы выкананы на 20 дзён раней мінулага году: засеяна на 15-VI 2.683.096 га—100,1 проц. пляну, у тым ліку: збожжавых—106,2 проц., ільну — 100,3 проц.,—бульбы—101,1 проц.

У тэрмінах сяўбы БССР выйшла ў лік перадавых рэспублік, адзяваяўшы ў спаборніцтве пярэдзіны ў Заходняй вобласьці.

Пасьпяховае правядзеньне сяўбы ў гэтым годзе дасягнуты ў результаце разгрому кулацкіх элемэнтаў у часе збожжазагатовак, умацаваньня калгасаў, стварэньня палітаддзелаў, мабілізацыі шырокіх калгасных мас вакол лёзунгу тав. Сталіна: «зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а калгаснікаў заможнымі», дзякуючы сапраўды ленінскаму штодзённаму практычнаму кіраўніцтву ЦК УсеКП(б) і тав. Сталіна па пытаньнях падрыхтоўкі сяўбы і ў ходзе самога правядзеньня сяўбы і ў выніку згуртаваньня калгаснага актыву вакол партыйных арганізацый.

Аднак, пленум паведамляе, што выкананьнем пляну веснавой сяўбы зроблен толькі першы крок для пасьпяховага правядзеньня ўсіх сельска-гаспадарчых работ гэтага году. Ніякім дэмабілізацыйным настроям, элемэнтам самасуцякою не павінна быць месца, бо асноўная работа, больш напружаная, яшчэ наперадзе.

Чарговыя задачы партыйных і савецкіх арганізацый заключаюцца ў тым, каб з большым посьпехам скончыць прапалачныя работы, акучваньне бульбы і гародніх культур, уздым папараў, правільна арганізаваць уборку і апрацоўку ўраджаю бяз страт, датэрмінова выканаць як па колькасьці, так і асабліва па якасьці здачу дзяржаве і загатоўкі па ўсіх відах сельгаспрадуктаў і своячасова падрыхтавацца да зяблевага ворыва і сяўбы азімых.

Пленум ЦК і ЦККК КП(б)Б у ажыцьцяўленьне пастановы ЦК і СНК СССР аб арганізацыі прапалачных і ўборачных работ пастанаўляе:

I.

1. З прычыны выключна спрыяючага надвор'я і ў сувязі з гэтым шпаркага пасьпяваньня збожжа, у зьмену пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 4 чэрвеня г. г. у частцы тэрмінаў уборкі ўстанавіць наступныя тэрміны: уборку збожжавых па кожнай культуры правесьці ў сярэдніх ня больш чым за 7—9 дзён з тым, каб усё жыта і азімая пшаніца былі ўбраны не пазьней 3—5 жніўня, а яравыя—12—17 жніўня.

2. У мэтах рашучай барацьбы са стратамі ў часе ўборкі, а таксама арганізацыі аховы ўраджаю ад зладзеяў і ўсякага роду кулацкіх шкоднікаў пленум прапануе:

а) уборку збожжавых культур праводзіць па меры пасьпяваньня паасобных вучасткаў, не чакаючы поўнага пасьпяваньня ўсяго поля. Абавязаць дырэктароў саўгасаў і старшынь калгасаў устанавіць, як правіла, падрабяпе каласоў, якія застаюцца за жанцом, касцом, не дапускаючы ніякіх страт;

б) побач з максымальным выкарыстаньнем мяккай тары для перавозкі збожжа (мабілізацыя ўсіх мясцовых рэсурсаў, выцяг іх) РК, РВК, дырэктарам МТС і саўгасаў ужываць усе меры для прыстасаваньня калёс па перавозцы збожжа бяз мяккай тары (у скрынях, бочках);

в) абавязаць дырэктароў саўгасаў, старшынь калгасаў праверыць становішча складаў, зрабіць дэзынфэкцыю. Абавязаць аб'яднаньне па барацьбе са шкоднікамі з сельскай гаспадарцы прыняць усе меры барацьбы са сьвярпавымі шкоднікамі (шацкі, жучкі і г. д.). Даручыць РК прасачыць за выкананьнем гэтай пастановы;

г) устанавіць, што за пастаноўку справы барацьбы са стратамі адказваюць: непасрэдна па калгасу—старшыня калгасу, брыгадзір—у брыгадзе; па МТС—дырэктар; за вучастак—загадчык вытворчага вучастку; па саўгасу—дырэктар саўгасу і на вучастку—старшы рабочы;

д) прапанаваць РК і РВК вылучыць адказнага работніка (з членаў бюро РК, або аднаго з кіруючых работнікаў РВК) спэцыяльна для арганізацыі і пастаяннага нагляду за аховай ураджаю, вызваліўшы яго ад усякай іншай работы на ўвесь пэрыяд уборачнай кампаніі.

Пленум ЦК і ЦККК звяртае асаблівую ўвагу РК і РВК, начпалітаддзелаў і дырэктароў саўгасаў і МТС, што ў справе барацьбы са стратамі павінна быць зьвернута выключная ўвага на ахову ўраджаю ў часе яго пасьпяваньня і асабліва ў часе яго ўборкі.

II.

1. Прапанаваць усім РК, начпалітаддзелам, РВК, дырэктарам МТС і саўгасаў, асаблівую ўвагу зьвярнуць па правільнае скарыстаньне малатарань, забясьпечыўшы абмалот усяго ўраджаю і ва ўсякім выпадку абмалот кожным без выключэньня калгасам у жніўні месяцы ўсяго збожжа, якое падлягае здачы дзяржаве (як азімых, так і яравых). У адпаведнасьці з гэтым пленум прапануе:

а) дырэктарам трактарацэнтраў, пад іх асабістую адказнасьць, на працягу трох дзён праверыць ход рамонту кожнай малатарні па адпаведных МТС, забясьпечыўшы не пазьней 1 жніўня прывядзеньне малатарань у поўны парадак, снабжаньне іх неабходнымі запчасткамі, а таксама складаньне дакладнага маршруту кожнай малатарні;

б) у сувязі з паяўнасьцю фактаў павыкупу МТС у калгасаў яшчэ да гэтага часу складаных і поўскладаных малатарань, механічнай цягі, ня гледзячы на тое, што ЦК УсеКП(б) вызначан тэрмін—10 чэрвеня,—прапанаваць дырэктарам трактарацэнтраў неадкладна закончыць выкуп гэтых машын.

Даручыць ЦККК-РСІ праверыць усе факты павыкупу малатарань, прычыны павыкупу і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці;

в) даручыць РВК, пад адказнасьць старшынь РВК, райза, правесьці праверку скончэньня рамонту конных і ручных малатарань, усклаўшы на іх адказнасьць за прывядзеньне конных і ручных малатарань у поўны парадак не пазьней 1 жніўня.

2. Лічыць неабходным: на пэрыяд работы малатарань да кожнай складанай і поўскладанай малатарні (больш 1 300) прымацаваць члена партыі або камсамольца для аказаньня дапамогі работнікам малатарні, усклаўшы таксама на іх адказнасьць за поўнае выкананьне ўстаноўленай нормы малацьбы, работы і стану самой малатарні.

3. Прапанаваць РК КП(б)Б, начп. палітаддзелаў, МТС, РК ЛКСМБ неадкладна прыступіць да адбору членаў партыі і камсамольцаў з ліку

Пастановы ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

Аб абавязковых пастаўках збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі з ураджаю 1933 году

Пастанова VII аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, прымаючы да кіраўніцтва кіраўніцтва пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве, звяртае ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі на тое, што:

«У адрозненне ад ранейшых год мы маем у гэтым годзе ня збожжазагатоўкі старога тыпу, якія праводзіліся на аснове ня зусім акрэсьленых кантрактацыйных дагавораў з сялянствам, а збожжапастаўкі, заснаваныя на цьвёрдым і бясспрэчным законе, абавязковым да выканьня ўсімі калгасамі і аднаасобнікамі. Гэта значыць, што ніякая ўхіленьне ад абавязацельстваў па здачы збожжа ў тэрмін не павінна быць дапушчана ні пад якім відам.

У адрозненне ад ранейшых год пастаўка збожжа дзяржаве ў гэтым годзе будзе праводзіцца не па зьменных цэнах, а па цьвёрдых нязьменных нормах, устаноўленых законам, што павінна ўмацаваць становішча калгасаў, павінна стварыць устойлівасьць у гаспадарцы і забясьпечыць калгасу і аднаасобніку магчымасьць цьвёрда разьлічыць свае даходы. Гэта значыць, што ніякія сустрэчныя пляны па здачы збожжа ў далейшым не павінны быць дапушчаны ні пры якіх умовах.

Нарэшце, у адрозненне ад ранейшых год, калі першыя два-тры месяцы збожжазагатовак, ліпень-жнівень-верасень, праходзілі ўпустую, на так званую «расказку», а ў наступныя месяцы прабавалі навярстаць упушчанае ў парадку ўжыванья рэпрэсій, — у збожжа пастаўках гэтага году рашаючымі месяцамі павінны быць першыя тры месяцы: ліпень-жнівень-верасень. Вопыт збожжазагатовак гаворыць, што іменна першыя тры месяцы вырашаюць лёс зататовак, бо тое, што ўпушчана ў гэтыя месяцы, ня можа быць адноўлена на працягу ўсяго загатоўчага году. Гэта значыць, што пастаўка збожжа дзяржаве павінна быць разгорнута з першых-жа дзён абмалоту, а калгасны гандаль павінен быць прыпынены з першых-жа дзён збожжапаставак» (з пастановы ЦК УсеКП(б).

Аднак, многія партыйныя і савецкія арганізацыі яшчэ фактычна па-баявому не разгарнулі ўсіх мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць поўнае і датэрміновае выкананьне пляну абавязковай пастаўкі збожжа дзяржаве.

Пленум адзначае, што сярод асобных работнікаў і арганізацый ёсьць настрої, быццам, закон па абавязковай пастаўцы ўжо сам па сабе забясьпечвае поўную здачу. Гэтыя самацёчныя настрої сьведчаць, што ня ўсімі яшчэ арганізацыямі зроблены неабходныя вывады з вопыту мінулага году, калі ў справе выкананьня пляну збожжазагатовак партыйныя і савецкія арганізацыі праявілі гнілаліберальныя адносіны да загатовак; сарваўшы гэтым усе тэрміны збожжазагатовак і расьцягнулі апошнія да студзеня месяца. Гэтыя-ж настрої сьведчаць аб неканкрэтнасьці, дэкларацыйнасьці, маючых месца ў рабоце гэтых арганізацый і да сёньняшняга дня. Гэтым настроям самацёку партыйныя арганізацыі павінны даць самы рашучы адпор, разгарнуць бязьлітасную барацьбу з элементамі заспакоенасьці, дэмабілізацыі, бо самацёк зараз больш чым калі-б там ні было небясьпечны, самацёк цяпер можа прынесьці да зрыву выкананьня пляну збожжапаставак.

Пленум яшчэ раз падкрэсьлівае, што па БССР жніўень, верасень павінны стаць рашаючымі месяцамі выкананьня збожжапаставак і ставіць перад усімі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі баявую задачу — разгарнуць сапраўды бальшавіцкую, масава-растлумачальную і арганізацыйную работу ў справе датэрміновага выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай з тым, каб БССР заняла адно з першых месц у Саюзе — як па тэрмінах, так і па якасьці здаваемай прадукцыі.

Гэта тым больш магчыма, што ў МТС і саўгасах БССР ужо арганізаваны, згодна пастановы ЦК УсеКП(б) у большасьці палітаддзелы, паказаўшыя з першых-жа дзён сваёй работы сапраўды бальшавіцкае ўменьне арганізаваць масы ў барацьбе за веснавую сяўбу, паказаўшыя сябе лепшымі арганізатарамі і кіраўнікамі калгасных мас у справе ўмацаваньня калгаснага будаўніцтва і барацьбе супроць кулацкіх, шкодніцкіх, апартуністычных элементаў на вёсцы.

Выходзячы з гэтага, пленум ЦК і ЦКК пастанаўляе:

I.

1. Спыніць, згодна саюзнага закону калгасны і індывідуальны сялянскі гандаль хлебам, а таксама закупку збожжа Закупхлебам па БССР з 1-га жніўня 1933 году

2. Згодна пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР устанавіць плян здачы збожжа дзяржаве, як мінімум: жніўні — 2,4 млн. пудоў, у верасьні — 5,4 млн пудоў.

Упаўнамоцить СНК, раённым упаўнаважаным, РК, палітаддзелам і РВК аднаведна з гэтым набудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць поўнае выкананьне намечаных намесячных пляноў, згодна ўручаных абавязацельстваў, здачы збожжа ўсімі саўгасамі, калгасамі, аднаасобнікамі, а таксама здачы насеньня і харчовай сеўды.

Даручыць Упаўнамоцить СНК прадставіць на зацьверджаньне бюро ЦК намесячныя, паранёныя апэрацыйныя планы аднаўлення аб паступленьнях, аднаведна з уручанымі абавязацельствамі.

Раённыя партыйныя арганізацыі ні ў якім выпадку не павінны ператвараць прынятае тэрміны здачы збожжа дзяржаве ў жніўні і верасьні месяцах у простае дэкларацыйнае, або простае бюракратычнае расьпісаньне на паперы. Толькі тая раённая партыйная арганізацыя і той палітаддзел МТС і саўгасу можа лічыцца перадавым у правядзеньні заготовак, які, сапраўды вывучыўшы кожны ў паасобку калгас, брыгаду і двор, правядзе сапраўдную палітычную і арганізатарскую масавую і растлумачальную работу сярод усіх калгаснікаў і аднаасобнікаў.

Усе раёны, МТС, калгасы і саўгасы на аснове разгортванья масавай работы, шляхам сапсапаборніцтва адзін з другім, павінны дабіцца даторміновага выкананьня пляну з тым, каб атрымаць права быць занесенымі на чырвоную дошку цэнтральнага органу нашай партыі—газэты «Праўда».

За выкананьне пляну збожжаздачы ў тэрмін і поўнасьцю адказны: па сельсавеце — старшыня сельсавету, па калгасе — старшыня калгасу, па саўгасе—дырэктар саўгасу, па МТС—дырэктар і начальнікі палітаддзелаў МТС; па раёне ў цэлым — сакратар РК і старшыня РВК.

Пленум абавязвае партыйныя арганізацыі і савецкія, у першую чаргу Бабруйскага, Магілёўскага, Рэчыцкага, Рагачоўскага, Пухавіцкага, Мазырскага, Быхаўскага, Чавусскага і іншых раёнаў, узяць з самага пачатку пад асобны нагляд арганізацыю выкананьня паставак збожжа аднаасобнікамі.

3. Прапанаваць РК і РВК не пазьней 1-га жніўня закончыць налічэньне і ўручэньне паведамленьняў аб памерах здачы збожжа калгаснікамі па збожжавых пасевах на прысядзібных зямлях, а таксама саўгасамі, прыгарадными гаспадаркамі: ОРС'аў, Наркамзнешгандалу, Наркамлегпраму, НКШЗ, АДПУ, Цэнтрасаюзу і мясцовых савецкіх арганізацый, дапаможных гаспадарак вайсковай часткі Цэнтрасаюзу, міліцыі і ўласных пасевах МТС.

4. Абавязаць сакратароў РК, старшынь РВК райвыканкамаў да 1-га жніўня даць канчатковую заключную вод-ку па ўсіх культурах падлягаючага да здачы збожжа ў разрэзе сектароў (паасобна—саўгасы, прыгарадныя, прыпісныя гаспадаркі, гаспадарчыя пасевы МТС, калгасаў, калгаснікаў, аднаасобнікаў, кулацкія гаспадаркі).

II.

1. Абавязаць Загатзбожжа закончыць будаўніцтва збожжасклядаў, пляцовак і навешай да 10 жніўня, а рамонт і дэзынфэкцыю складаў да 1 жніўня.

Кантроль за дакладным выкананьнем тэрмінаў будаўніцтва і рамонту складаў на месцах усклясьці персанальна на старшынь РКК-РСІ. У раёне, дзе будуюцца новыя склады, прапанаваць РВК на будаўнічы пэрыяд вылучыць члена прэзыдыуму спэцыяльна па нагляду за гэтым будаўніцтвам.

Поўную адказнасьць за выкананьне пляну будаўніцтва і рамонту складаў у цэлым па рэспубліцы ў намечаныя тэрміны ўсклясьці на тав. **Журомскага.**

2. Улічваючы, што паступаючае збожжа ў Ельскім, Жыткавіцкім, Камарынскім, Лельчыцкім, Пятрыкоўскім, Нараўлянскім і Тураўскім раёнах амаль поўнасьцю скарыстоўваецца на месцы і для ўнікненьня сустрэчных перавозак, прыёмку збожжа даручыць у гэтых раёнах БКС, абавязаўшы тав. **Царонка** арганізаваць прыёмачныя пункты ў гэтых раёнах. Упаўнамоцить СНК зацьверджаць гэтыя прыёмачныя пункты.

Прапанаваць БКС, пад адказнасьць тав. **Царонка**, падабраць ва ўказаных раёнах спэцыяльных работнікаў у якасьці намесьнікаў старшынь райспажыўсаюзаў з непасрэдным іх абавязкам весьці работу па прыёмцы збожжа, усклаўшы на старшынь БКС і намесьнікаў таксама адказнасьць і за захаваньне збожжа.

III.

1. Абавязаць Упаўнаркамцяжпрам, пад адказнасьць т. т. **Амбражуйса** і **Левіна**, вырабіць для Загатзбожжа 115 комплектаў гір і 85 вагаў.

2. Абавязаць Загатзбожжа забясьпечыць усе прыёмачныя пункты тарай, вагамі, брэзэнтам не пазьней 1 жніўня.

3. Прапанаваць Белкаапсаюзу, пад адказнасьць тав. **Царонка** і дырэктараў саўгастрэстаў здаць Загатзбожжа ўсю запазычанасьць мяшка-тары.

Даручыць РСІ прыняць неабходныя меры ў адносінах арганізацый і асоб, якія сыстэматычна пазкуратна вяртаюць тару.

4. У сувязі з тым, што асноўная колькасьць збожжа, якое падлягае здачы дзяржаве, будзе праходзіць у жніўні і верасьні месяцох, для чаго патрабуецца значная колькасьць мяшка-тары, прапанаваць РК і РВК неадкладна правесьці мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў мяшка-тары, забясьпечыўшы неабходны яе рамонт.

5. Адзначаючы, што кожны год у пэрыяд загатовак адным з сур'ёзнейшых тармазоў свячасовай здачы збожжа дзяржаве калгаснікамі і аднаасобнікамі зьяўляецца дрэнне становішча дарог, прапанаваць усім РК і РВК правесьці ход рамонту дарог і мастоў у сваіх раёнах з тым, каб былі прыняты ўсе меры да фарсаваньня скарэньня рамонту дарог і мастоў не пазьней 10—15 жніўня. Аднаведна з свячасовае і поўнае скарэньне рамонту дарог у межах сельсавету ўсклясьці на старшынь сельсаветаў, у калгасах—на старшынь калгасаў і саўгасах—на дырэктараў саўгасаў.

Усклясьці поўную адказнасьць за свячасовае і поўнае скарэньне работы на рамонце дарожных, пад'язных пляхоў да пунктаў здачы збожжа, прыстаняў і станцый, —на старшынь РВК.

У аднаведнасьці з законам пра абавязковы працоўны ўдзел насельніцтва ў дарожным будаўніцтве, прапанаваць РВК і сельсаветам прымаць аднаведныя меры зьдзеяньня па выкананьні рамонту дарожных, пад'язных пляхоў.

6. Абавязаць дзяржбанк адкрыць да 1-га жніўня ў кожным прыёмачным пункце прыпісныя разліковыя касы па збожжы, з улікам, каб касы працавалі ва ўсе гадзіны работы пункту і была свячасовая, акуратная расплата са здатчыкамі. Практычнае правядзеньне вырашэньня гэтага пункту ўсклясьці на кіраўніка Белканторы Дзяржбанку тав. **Фэльдмана**, упаўнаважанага Загатзбожжа тав. **Журомскага** і старшыню БКС тав. **Царонка.**

7. Персанальную адказнасьць за забясьпячэньне прыёмачных пунктаў прыёмачнымі квітанцыямі, ордэрамі і іншымі дакумэнтамі прыналежнасьцямі ўсклясьці на загадчыкаў прыёмачных пунктаў; адказнасьць за поўнае і свячасовае снабжэньне пунктаў гэтымі прыналежнасьцямі — усклясьці на тав. **Журомскага.**

8. Даручыць аддзелу кадраў ЦК і РК КП(б)Б у 5-дзённы тэрмін правесьці праверку і ўмацаваньне работнікамі месцовага апарату Загатзбожжа, у прыватнасьці сакратаром РК, праверыць ход і якасьць набору работнікаў для збожжаскладаў, які праводзіцца зараз па лініі Наркамфіны (прыёмшчыкі, таксыроўшчыкі, касіры, рахункаводы, бухгальтары).

9. Абавязаць Загатзбожжа забясьпечыць стварэньне на загатоўчых пунктах неабходных умоў для культурна-бытавога абслугоўваньня збожжаздатчыкаў (чайныя, чырвоныя куткі), а таксама арганізацыю для гужа-конявязі і вадапою.

10. Прапанаваць сакратаром РК КП(б)Б сумесна з РК ВЛКСМБ на ўвесь пэрыяд работы загатоўчых пунктаў вылучыць спэцыяльныя брыгады ў ліку 2—3 чалавек на чале з адным з кіруючых работнікаў раёну для вядзеньня культурна-масавай растлумачальнай работы сярод здатчыкаў і нагляду за работай прыёмачных пунктаў.

11. Усклясьці персанальную адказнасьць на старшынь РВК і загадчыкаў прыёмачных пунктаў за тое, каб на прыёмачных пунктах збожжа—здаваемая прадукцыя прымалася неадкладна і ва ўсякім выпадку не пазьней, чым праз 3 гадзіны пасьля прыезду здатчыкаў.

Кэнтроль за выкананьнем гэтай часткі пункту ўсклясьці на РСІ і органы пракуратуры.

12. У аднаведнасьці з пастановай СНК Саюзу, прапанаваць Загатзбожжа тав. **Журомскаму** ўстанавіць работу прыёмачных пунктаў з 5-цігадзін раніцы да 9 гадз. вечару і для прыёмкі збожжа ад саўгасаў—кругласутачную. Разам з тым, улічваючы вопыт мінулага году, калі з-за фармальна-бюракратычных адносін работнікаў прыёмачных пунктаў мелі месца выпадкі звароту назад здатчыкаў з непрынятым збожжам,—прапанаваць РВК прыняць усе неабходныя меры каб не дапусьціць гэтых зьявішч у даную загатоўчую кампанію.

***

Пленум папярэджвае ўсе партыйныя, савецкія і загатоўчыя арганізацыі, што ЦК і ЦКК КП(б)Б не пацерпіць паўтарэньня памылак мінулага году і з усёй жорсткасьцю будуць караць вінаватых, зрываючых свячасовае выкананьне пляну па абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве. У аднаведнасьці з гэтым будзе давацца ацэнка работы партыйных і савецкіх арганізацый дапага раёну, а таксама здольнасьці кіраўніцтва па-бальшавіцку змагацца за выкананьне ўскладзеных партыяй і ўрадам важнейшых задач.

АБ ХОДЗЕ ЧЫСТКІ КП(б)Б

Рэзалюцыя па дакладу тав. АНЦІПАВА

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, заслухаўшы даклад старшыні рэспубліканскай камісіі аб ходзе чысткі КП(б)Б, канстатуе, што разгортванье чысткі партыйнай арганізацыі Беларусі ўжо ў самым пачатку спрыяе значнаму ажыўленьню партыйна-масавай работы, павышэньню бальшавіцкай баяздольнасьці, дысцыпліны ў партарганізацыі і дало рэзкі зрух у справе марксыцка-ленінскага тэарытычнага ўзбраеньня членаў і кандыдатаў партыі. Значна ўзрасла палітычная і вытворчая актыўнасьць рабочых, калгасных і працоўных мас аднаасобнікаў.

Пленум ЦК і ЦКК адзначае вялікую палітычную і практычную работу, праробленую рэспубліканскай камісіяй па арганізацыі, разгортваньні і кіраўніцтве справай чысткі, дакладны, прадуманы падбор праверкомаў, канкрэтную і апэрацыйную дапамогу і кіраўніцтва гарадзкімі і раённымі камісіямі па чысткі, што забясьпечыла ў самым пачатку чысткі хуткае выяўленьне і выпраўленьне памылак і недахопаў, меўшых месца пры правядзеньні чысткі ў радзе раёнаў, а таксама бальшавіцкую прынцыповасьць, прадуманы падыход да кожнай у паасобку партарганізацыі, спалучэньне задач чысткі з выкананьнем асноўных гаспадарчых і палітычных задач, якія стаяць перад КП(б)Б, што стварыла ў ходзе чысткі здаровае, бальшавіцкую абстаноўку і значна павысіла бальшавіцкую баяздольнасьць усёй КП(б)Б.

Пленум адзначае, што створаныя пастановай студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) палітаддзелы сваёй практычнай масава-палітычнай работай на вёсцы аказалі і аказваюць вялікую практычную дапамогу камісіям па чысткі радоў партыйнай арганізацыі КП(б)Б.

У рэзультаце бальшавіцкай самакрытыкі, якая разгортваецца ў працэсе чысткі партыі, ужо ў пачатку чысткі павысілася рэвалюцыйная пільнасьць у радох партыі і рабочай класы, што дало магчымасьць выкрыць клясава-чужыя элементы, перараджэнцаў і агентаў клясавага ворага, якія пралезьлі ў рады партыі, прыкрываючца партыйным білетам у кішэні і выступаюць пад фальшыва-нацыянальным сьцягам на асобных важнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама ўскрыць пры правядзеньні чысткі яшчэ меўшую месца двурушніцкую работу вялікадзяржаўніцкіх нацыянал-апартуністычных элементаў, рэштак Бунду, нацдэмаў і інш. контр-рэвалюцыйных дробна - буржуазных нацыяналістычных партый. Гэта выкрываўчая работа дае магчымасьць раскрыць усю клясава-варожую контр-рэвалюцыйную сутнасьць гэтых недабітых асколкаў перад шырокімі рабочымі і калгаснымі масамі Беларусі.

Разам з тым пленум адзначае, што падрыхтоўчая работа да чысткі ў большасьці партыйных арганізацый у пачатку была праведзена нездавальняюча, што прывяло да некаторай зацягкі чысткі ў асобных арганізацыях, да невыстарчальна прадуманага падбору кандыдатур у ячэйковыя праверкомы, невыстарчальнага наведваньня, асабліва з боку беспартыйных рабочых, калгаснікаў, першых сходаў па чысткі.

Істотным недахопам падрыхтоўкі да чысткі зьяўляецца невыстарчальны ўдзел камсамолу ў большасьці раёнаў Беларусі ў рабоце па чысткі. Значная колькасьць камсамольскіх арганізацый не зразумела, што чыстка радоў партыі пры актыўным удзеле камсамолу забясьпечыць рэзкі зрух у справе паляпшэньня партыйнага кіраўніцтва камсамолам і аказаньня канкрэтнай штодзённай дапамогі партыйных арганізацый камсамолу ў яго рабоце, а таксама ў справе бальшавіцкага ленінскага выхаваньня камсамолу.

Такое-ж неразуменьне мае месца і з боку прафсаюзаў, якія да гэтага часу яшчэ ня ўключыліся ў падрыхтоўку да чысткі, зусім выпускаючы з-над увагі, што чыстка зьяўляецца адным з важнейшых зьвеньняў павышэньня рэвалюцыйнай пільнасьці і палітычнай школай выхаваньня рабочых мас у духу камунізму. У бліжэйшыя дні прафсаюзы Беларусі павінны забясьпечыць больш актыўны і поўны ўдзел шырокіх беспартыйных мас у правядзеньні чысткі партыі.

Пленум ЦК і ЦКК лічыць, што партыйныя арганізацыі Беларусі абавязаны зрабіць з напярэдніх даных ходу чысткі ўсе неабходныя палітычныя і практычныя вывады і абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі, асабліва тыя, дзе чыстка яшчэ не пачыналася, улічыць памылкі, недахопы, што выявіліся як у падрыхтоўцы, так і ў ходзе чысткі, з тым, каб яшчэ больш узмацніць канкрэтную штодзённую і актыўную дапамогу камісіям па чыстцы.

Важнейшай задачай партыйных арганізацый зьяўляецца такое замацаваньне рэзультатаў чысткі як у кожнай асобнай ячэйцы, так і партыйнай арганізацыі ў цэлым, якое забясьпечыла-б карэнную перабудову ўсёй партыйнай работы ў бок разгортваньня сапраўды арганізатарскай і глыбокай палітычнай масавай работы, рашучага адмаўленьня ад практыкі голага адміністраваньня і ахопу палітычным уплывам і бальшавіцкім узьдзеяньнем кожнага рабочага і калгаснікa, а таксама ўмацаваньне нізавога і сярэдняга зьвяна на прадпрыемстве, у саўгасе, калгасе.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б звяртае асаблівую ўвагу гаркомаў, райкомаў і кантрольных камісій на необходнасьць свячасовага рэагаваньня і ліквідацыі ўскрываемых у ходзе чысткі недахопаў, прарываў. У першую чаргу неабходна прыступіць да падбору моцных праверэных бальшавіцкіх кадраў для замены вычышчаных, шырока высоўваючы паказаўшых сябе на практычнай рабоце ўдарнікаў з асяродзішча рабочых, калгаснікаў, даказаўшых адданасьць справе сацыялізму.

Важнейшай задачай, на свячасовае, бальшавіцкае выкананьне якой павінна аказаць свой мабілізуючы ўплыў чыстка, зьяўляецца правядзеньне ўборкі ўраджаю і збожжаздачы дзяржаве і выкананьне іншых важнейшых гаспадарча-палітычных задач партыі і ліквідацыя адставаньня работы прамысловасьці асабліва па Віцебску, Гомелі, Менску, Бабруйску.

Пленум прапануе цэнтральнаму органу БССР, раённаму, фабрычна-заводзкаму, МТС, шырока асьвятляць задачы і ход чысткі, не дапускаючы меўшых месца мэтадаў аднабаковага падыходу ў асьвятленьні чысткі, аказваючы ўсямерную дапамогу і садзейнасьць камісіям па чыстцы ў справе выяўленьня і выгнаньня з партыі чужых і нягодных элементаў, а таксама ў справе паказу масам сапраўдных бальшавікоў, вартых высокага званьня члена ленінскай партыі.

Пленум ЦК і ЦКК абавязвае кожную партыйную арганізацыю разгарнуць сур'ёзную глыбокую палітычна-выхаваўчую работу як з кожным пераведзеным у рэзультаце чысткі ў кандыдаты і спачуваючыя, так і з усімі членамі і кандыдатамі партыі. Вывучаючы выяўленымі ў ходзе чысткі лепшы і адданы нам беспартыйны актыў, партыйныя арганізацыі павінны забясьпечыць сыстэматычную работу па вырошчваньні і арганізацыі гэтага актыву на канкрэтнай рабоце за выкананьне баявых лёзунгаў і задач партыі і ўраду.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК падкрэсьлівае, што партыйная арганізацыя Беларусі, ГК, РК, парт'ячэйкі павінны забясьпечыць бальшавіцкае правядзеньне чысткі партыйных радоў і ператварыць чыстку партыі ў магутны сродак пасьпяховага выкананьня асноўных гаспадарча-палітычных задач партыі, узмацненьня партыйнага ўплыву на пралетарскія, калгасныя масы, выхаваньня гэтых мас у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Пленум ЦК і ЦКК выказвае поўную ўпэўненасьць, што беларуская партыйная арганізацыя, ачысьціўшы свае рады, яшчэ больш павысіўшы сваю бальшавіцкую баяздольнасьць, рэвалюцыйную пільнасьць, жалезную бальшавіцкую дысцыпліну, стане яшчэ больш маналітнай, моцнай і пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) на чале з правадыром і настаўнікам тав. Сталіным забясьпечыць выкананьне тых вялізарных і адказных задач, якія перад ёю паставлены.

Рэзалюцыя аб задачах партарганізацыі БССР па правядзеньні ў жыцьцё пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб перабудове работы на чыгуначным транспарце

1. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б разам з Менскім партактывам поўнасьцю і палкам ухваляе пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб перабудове работы на чыгуначным транспарце і пастанову ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах на чыгунцы. Гэтыя гістарычныя пастановы маюць выключнае палітычнае значэньне, зьяўляючыся баявой праграмай работы чыгуначнікаў, забясьпечваючы ўздым чыгуначнага транспарту да ўзроўню патрабаваньняў, якія прад'яўляюцца гіганцкім ростам сацыялістычнай гаспадаркі ўсяго Савецкага саюзу.

Ня гледзячы на значны рост тэхнічных сродкаў на чыгунках МББ і Заходняй, якія забясьпечваюць поўную магчымасьць дарогам, раёнам, вузлом, станцыям дэпо і дыстанцыям значнага паляпшэньня работы і поўнага выкананьня колькасных і якасных вымяральнікаў, — усё-ж у рэзультаце фармальна-бюракратычных мэтадаў работы як дырэкцыі дарог, так і раёнаў, засьмечанасьці цэлага раду зьвеньняў клясава-чужымі, шкодніцкімі элементамі, прытушэньне клясавай пільнасьці транспартных партарганізацый, дрэнная работы камуністаў, якія не змагаліся па-бальшавіцку за аўладаньне тэхнікай і 6-цю пяцігадзьдзямі тав. Сталіна, на транспарце стварылася становішча, калі на ўсіх раёнах БССР мае месца рост крушэньняў, парушэньне працоўчай дысцыпліны, зрывы спаранай яды, рост паўторнасьці рамонтаў, зьніжэньні плянаў нагрузкі (у першым квартале 1932 году сярэдняя сутачная нагрузка дасягнула 4.275 вагонаў, а ў першым квартале 1933 году нагрузка ўпала на 3.712 вагонаў), нагоршыўся зварот таварнага вагону, ня выконваюцца заданьні па тэхнічнай і камэрцыйнай скорасьці паязьдоў.

Усё гэта лішні раз і поўнасьцю пацьвярджае свячасовасьць прынятых пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР па транспарце і правільнасьць жорсткай бальшавіцкай крытыкі работы чыгуначнікаў, якія самі не змаглі на аснове раду пастаноў ЦК УсеКП(б) замацаваць дасягненьні, што вызначаліся ў рабоце чыгунак у зімовы пэрыяд 1931-32 г., дапусьцілі яшчэ большае пагоршаньне і без таго нездавальняючай работы чыгуначных раёнаў БССР.

2. Пленум адзначае, што пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове работы на транспарце атрымала з боку рабочай масы чыгуначнікаў і большасьці спэцыялістаў поўнае ўхваленьне, выклікала сярод іх гарачы энтузіязм і рост ударніцтва на вытворчасьці. Разам з тым, аднак, практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК аб перабудове работы на транспарце сустрэла на ўсіх чыгуначных раёнах БССР яўны сабатаж і супраціўленьне з боку перараджэнцаў, двурушнікаў і чыноўніцка-бюракратычных элементаў, прычым гэта супраціўленьне ня толькі не атрымала рашучага бальшавіцкага адпору з боку раду партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных кіраўнікоў транспарту (Жлобін), а, наадварот, рад фактаў паказвае, што гэтыя работнікі і арганізацыі сталі на шлях гнілога примірэньніцтва да сабатажнікаў і змазваньня фактаў супраціўленьня ў справе ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК і СНК аб чыгуначным транспарце.

3. Пленум абавязвае ўсіх кіраўнікоў партыйных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый і ўсіх членаў і кандыдатаў партыі чыгуначнага транспарту БССР неадкладна поўнасьцю перабудаваць работу ўсіх зьвеньняў транспарту на аснове пастаноў ЦК і СНК, паказаўшы сапраўдныя ўзоры бальшавіцкай барацьбы з апартуністамі, бюракратамі, перараджэнцамі, бязьлітасна выганяючы з чыгуначнага транспарту ўсе клясава-чужыя элементы, забясьпечыўшы і ўзмацніўшы ініцыятыву рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу, [illegible] барацьбу з лодырамі, разгільдзяямі, прагулышчыкамі. Пленум патрабуе ўсямернай барацьбы за ўзьяднаньне прадукцыйнасьці працы, за сьвядомую пралетарскую дысцыпліну і сапраўднае аўладаньне тэхнікай вытворчасьці.

4. Пленум абавязвае партарганізацыі чыгуначных раёнаў арганізаваць сыстэматычнае вывучэньне асноўных кадраў, якія працуюць на транспарце, уводзячы рашучы курс на прасоўваньне на кіруючую гаспадарчую, прафсаюзную і партыйную работу праверэных, паказаўшых сябе на рабоце камуністаў і беспартыйных рабочых, аказаўшых ім практычную дапамогу ў іх рабоце, стварэньне для гэтай мэты неабходных умоў.

5. Адзначаючы, што да гэтага часу партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі раёнаў, дэпо, станцый і дыстанцый яшчэ не прыступілі да практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК і СНК аб перагляде норм і перабудовы сыстэмы аплаты працы, — абавязаць трыкутнікі гаспадарчых адзінак, пад іх поўную адказнасьць, неадкладна прыступіць да ліквідацыі раздробленых норм і перабудовы сыстэмы зарплаты на аснове ўказаньняў ЦК і СНК, не чакаючы дадатковых загадаў па гэтым пытаньні. Уся работа па перагляде норм і расцэнак павінна быць праведзена пад кутом гледжаньня практычнай рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна аб ліквідацыі ўраўнілаўкі, абязьлічкі і на гэтай аснове ўзьняць прадукцыйнасьць працы і палепшыць якасьць усёй работы.

6. Пленум адзначае буйнейшае палітычна-гаспадарчае значэньне арганізацыі палітаддзелаў на чыгунках у справе карэннай перабудовы работы транспарту, укараненьня сьвядомай пралетарскай дысцыпліны, рашучай барацьбы з фармальна-бюракратычнымі мэтадамі кіраўніцтва, фактамі «очковтирательства», змазваньня недахопаў сваёй работы, барацьбы з клясава-варожымі элементамі і разгортваньне самакрытыкі. Пленум прапануе ўсім партарганізацыям забясьпечыць канкрэтную дапамогу палітаддзелам у справе практычнага правядзеньня ў жыцьцё пастаноў ЦК і СНК на транспарце і дапамагчы практычна ажыцьцявіць патрабаваньне тав. Сталіна: «узяцца, нарэшце, па-бальшавіцку за справу транспарту і рушыць яе наперад». Пленум даручае бюро ЦК патабраць неабходную колькасьць палітычна падрыхтаваных, праверэных у рабоце камуністаў для работы ў апаратах палітаддзелаў.

7. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б разам з партактывам з усёй сілай падкрэсьлівае, што асноўная задача камуністаў чыгуначнікаў заключаецца ў тым, каб на справе даказаць бальшавіцкую пасьлядоўнасьць у справе ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК і СНК, памятаючы, што партыя не пацерпіць у далейшым ніякай расхлябанасьці ў рабоце транспарту, не дапусьціць, каб работай кіравалі па-старому. Партыя паставіць па-за радзе ўсіх тых, хто сваім примірэнцтвам, гніла-ліберальнымі, мяшчанска-абыватальскімі адносінамі будзе перашкаджаць аздараўленьню транспарту. Пленум падкрэсьлівае, што справай гонару бальшавікоў транспарту зьяўляецца поўная і быстрая карэнная перабудова ўсіх зьвеньняў работы транспарту БССР, выпраўленьне дапушчаных памылак і ўзлом работы так, каб транспарт поўнасьцю забясьпечыў шпаркі рост сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі і усяго Савецкага саюзу, зрабіўшы транспарт магутным рухавіком сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны.

ПАЧАЛІ ЗЯБЛІВА

РАГАЧОЎ, 31. (БЕЛТА).

Калгасы МТС першымі ў раёне прыступілі да зяблёва. На 31 ліпеня па калгасах Забалоцкага сельсавету зазяблена 20 гектараў.

ВЫКАНАЛІ ПЛЯН--АТРЫМЛІВАЮЦЬ АВАНСЫ

Калгас «Бярозкі», Навасельскага сельсавету, 29 ліпеня здаў 7 цэнтнэраў жыта. 30 ліпеня, прымаючы ўдзел у чырвоным абозе імя тав. Гікало, калгас здае яшчэ 13 цэнтнэраў, выконваючы гэтым самым плян здачы азімых дзяржаве. 31 ліпеня прыступаем да выдачы калгаснікам авансаў у кошт працадзён.

ЗА МЯЖОЙ

Магутная барацьба міжнароднага пралетарыяту супроць небясьпекі імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР

ПАРЫЖ, 30. (БЕЛТА). Сёньня пад кіраўніцтвам антываенных арганізацый, створаных у рэзультаце амстэрдамскага кангрэсу 1932 г., у разных прыгарадах БАНЬОЛЕ, ІЗРЫ, СЭН-ДЭНІ і УЯ арганізаваны масавыя дэманстрацыі супроць пагрозы імпэрыялістычнай вайны і фашызму. У сувязі з гэтымі дэманстрацыямі «ЮМАНІТЭ» публікуе адозву міжнароднага і антываеннага (Амстэрдамскага) камітэту і Усефранцускага антыфашысцкага сакратарыяту. Адозва заклікае рабочых, якія ўваходзяць у сацыялістычную партыю і рэфармісцкія прафсаюзы, стварэць адзінства ў барацьбе, арганізоўваць на прадпрыемствах антыфашысцкія камітэты, якія-б аб'ядноўвалі камуністаў і сацыялістаў — членаў прафсаюзаў і неарганізаваных. Адозва заканчваецца заклікам да масавага ўдзелу ў дэманстрацыях 30-га ліпеня і 1 жніўня супроць фашызму і вайны.

***

ЛЁНДАН, 30. (БЕЛТА). Сёньня ў ЛЁНДАНЕ адбылася масавая антываенная дэманстрацыя, якою адбывацца антываенны тыдзень па ўсёй краіне. У правінцыі галоўныя дэманстрацыі адбудуцца першага жніўня. У сёньняшняй дэманстрацыі прымала ўдзел 10 тысяч дэлегатаў з розных цэнтраў Англіі. На чале асноўнага атраду ішла група былых удзельнікаў вайны, якая несла сьцяг з надпісам «Стварайце адзіны фронт супроць вайны».

Аб посьпеху кампаніі за адзіны фронт сьведчыць таксама вялікая колькасьць сьцягаў прафсаюзных і кааперацыйных арганізацый, у тым ліку транспартнікаў, чыгуначнікаў, дрэваапрацоўшчыкаў і інш. Машынабудаўнічыя рабочыя былі прадстаўлены Лёнданскім акруговым камітэтам саюзу.

У дэманстрацыі прымалі ўдзел таксама дэлегацыі ад саветаў прафсаюзаў Шордзітча і Ромфарда. Па дарозе да Гайдпарку дэманстранты раздалі вялікую колькасьць антываеннай літаратуры. У Гайдпарку да іх далучыліся новыя натоўпы рабочых. З 6 трыбун выступалі кіруючыя дзеячы кампартыі і незалежнай рабочай партыі. Наперакор забароне пейбарысцкага кіраўніцтва, з прамовамі выступілі пейбарысцкая дэпутатка палаты абшчын Элена Вількенсон, старшыня саюзу гандлёвых служачых Джэгар і інш.

***

**БЭРЛІН, 30. (БЕЛТА

Міжнародныя імпэрыялісты ліхаманкава рыхтуюцца да новай сусьветнай імпэрыялістычнай вайны, толькі СССР рашуча і пасьлядоўна праводзіць палітыку міру

Няхай жыве міжнародны антываенны дзень

Мірная палітыка СССР

Сёньня ў міжнародны антываенны дзень, калі ва ўсіх капіталістычных краінах пралетарыят будзе дэманстраваць сваю волю і гатоўнасьць да барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і антысавецкай інтэрвэнцыі, мільёны працоўных будуць глядзець у бок СССР—адзінай краіны, якая жыўхільна ажыцьцяўляе палітыку міру. Гэта палітыка міру знайшла сваё яркае пацьверджаньне ў дзейнасьці савецкай дэлегацыі на жэнэўскай канфэрэнцыі па разьбраеньні і лёндонскай эканамічнай канфэрэнцыі.

Імкнучыся да таго, каб зрабіць немагчымым вядзеньне вайны, СССР прапановаў у Жэнэве правесьці поўнае разьбраеньне, зьнішчыць усе віды ўзбраеньня. Імпэрыялістыцныя ўрады адзінадушна адхілілі савецкія прапановы і гэтым самым пацьверзілі, што імпэрыялізм немагчым без вайны. Тады савецкая дэлегацыя прапанавала правесьці хаця-бы частковае скарачэньне ўзбраеньня і прыняць на канфэрэнцыі па разьбраеньні азначэньне агрэсара (боку, які нападае), якое асудзіла-б усякі напад на чужую тэрыторыю, якімі-б матывамі ён не апраўдваўся. Але гэтыя выразныя савецкія прапановы сустрэлі ўпартае супраціўленьне імпэрыялістаў, асабліва Англіі і Японіі. Нарэшце галасамі новалікіх дзяржаў, у якіх маюцца падставы падтрымліваць савецкае азначэньне агрэсара, савецкая прапанова была прынята.

Але савецкі ўрад ішоў далей у сваёй барацьбе за мір. Савецкая дэлегацыя выступіла і на лёндонскай сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі з прапановай забараніць усякі эканамічны напад. І гэта прапанова сустрэла супраціўленьне буржуазіі. У той-жа час сусьветная эканамічная канфэрэнцыя, як і жэнэўская канфэрэнцыя па разьбраеньні, ператварылася ў арэну барацьбы супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі краінамі, што яшчэ больш узмацніла ваенную небясьпеку. Пахабнае выступленьне Гугенберга, які адкрыта прапанаваў ад імя германскага фашызму капіталістычным дзяржавам свае паслугі для арганізацыі антысавецкай інтэрвэнцыі, пераклічка правадыроў германскага фашызму з ангельскімі цьвёрдалобымі, адкрытае абмеркаваньне плянаў Гугенберга аб аддзяленьні Савецкай Украіны ад СССР—усё гэта зьвеньні аднаго ланцугу падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

На гэтым фоне з асаблівай яркасьцю выступае роля СССР, як выключна важнага міжнароднага фактару ў барацьбе за мір.

СССР заключыў яшчэ раней пакты аб непападзе з Францыяй, Польшчай і іншымі краінамі. Карыстаючыся сваім прабываньнем на міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі, тав. Літвінаў заключыў дагаворы аб азначэньні агрэсара з радам дзяржаў: Чэха-Славакіяй, Юга-Славіяй, Эстоніяй, Латвіяй, Польшчай, Румыніяй, Турцыяй, Пэрсіяй, Афганістанам і Літвой. Да гэтага дагавору апошнімі дням далучылася і Фінляндыя. Гэтыя дагаворы асуджаюць ваенны напад на тэрыторыі чужой краіны, якімі прычынамі ён не апраўдваўся, узмацняюць межы Савецкага Саюзу і маюць вялізарнае міжнароднае значэньне ў барацьбе за мір зараз, калі ўсе рыхтуюцца да вайны. Гэта вымушае падкрэсьліць нават варожы нам буржуазны друк. Асабліва трэба падкрэсьліць значэньне падпісаньня пактаў аб непападзе з Францыяй, Польшчай, таму што Францыя на працягу доўгіх гадоў узначальвала антысавецкі імпэрыялістычны фронт, а яе саюзьнікі павінны былі адыгрываць ролю перадавога атраду ў вайне супроць СССР.

Ня гледзячы на яркія антысавецкія тэндэнцыі германскага фашызму, СССР дабіўся працягу бэрлінскага дагавору, на аснове якога на працягу раду гадоў рэгулюецца германа-савецкія адносіны. СССР заключыў таксама новую гандлёвую і крэдытную згоду з Італіяй. Нарэшце вялікую перамогу атрымаў СССР, разьбіўшы спробы ангельскіх цьвёрдалобых арганізаваць эканамічную блёкаду СССР шляхам абвяшчэньня эмбарго на ўвоз савецкіх тавараў у Англію. Пасьля трохмесячнага разрыву гандлёвых зносін ангельскі ўрад быў вымушан скасаваць эмбарго і аднавіць перамовы аб заключэньні гандлёвага дагавору з СССР. У апошнія-ж дні мы маем факт прызнаньня дэ-факта і дэ-юрэ СССР Гішпаніяй.

У рэзультаце пасьпяховага выканаяньня пяцігодкі ў чатыры гады СССР настолькі разьвіў сваю гаспадарчую і ваенную магутнасьць, што ён зрабіўся першаразрадным фактарам міжнароднай палітыкі, з якім вымушаны лічыцца капіталістычныя краіны. Урэшце зьмяніліся і суадносіны сіл у Эўропе. Зьнешнепалітычныя агрэсыўныя тэндэнцыі германскага фашызму, імкненьне яго да рэваншу за паражэньне ў вайне 1914-18 г. г.—пагражаюць падарваць пазыцыі Францыі на кантынэнце, пагражаюць пазбавіць Польшчу выхаду да мора, пагражаюць рэвізіяй межаў дзяржаў Малой Антанты і пагрыбленьнем прыбальтыцкіх краін. Вось чаму ўсе гэтыя краіны, прабуючы ўмацаваць свае пазыцыі, шукаюць апоры ў Савецкім Саюзе.

Зусім іншыя мэты ставіць сабе савецкая мірная палітыка. Савецкі Саюз ня імкнецца да захопу чужых тэрыторый. Заключыўшы дагаворы з рознымі капіталістычнымі краінамі, якія належаць да розных імпэрыялістычных груповак, СССР падкрэсьліў, што ён ня мае намеру зьвязвацца з якой-небудзь групоўкай імпэрыялістычных краін і ўдзельнічаць у іх барацьбе адной супроць другой.

Працоўныя СССР не пераацэньваюць, аднак, значэньня дагавораў, якія заключаны СССР з капіталістычнымі краінамі. Яны ведаюць, што гэтыя дагаворы ускладняюць [illegible] СССР, але не [illegible] небясьпекі антысавецкай інтэрвэнцыі. Яны ўлічваюць, што рад суседніх краін (Японія) не заключыў з намі ні пактаў аб непападзе ні дагавораў аб азначэньні нападаючага боку.

З гэтага выцякае, што сапраўдную гарантыю мірнай працы працоўным СССР можа даць толькі далейшае пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва, далейшае ўзмацненьне абароназдольнасьці нашай краіны і ўзмацненьне барацьбы працоўных капіталістычных краін супроць сваёй буржуазіі, супроць падрыхтоўкі да новай вайны. 1 жніўня, у міжнародны антываенны дзень працоўныя Савецкага Саюзу таму з асобай сілай падкрэсьліваюць сваю салідарнасьць з рэвалюцыйнай антываеннай барацьбой рабочых і сялян за рубяжом і разам з тым сваю гатоўнасьць змагацца далей за пабудову сацыялістычнага грамадзтва ў краіне, якая зьяўляецца апорай працоўных усяго сьвету.

І. ДЭРФЭЛЬ.

ДА 1-ГА ЖНІЎНЯ 1933 ГОДУ

Абстаноўка, у якой мы сустракаем 1 жніўня 1933 г., ва многім нагадвае абстаноўку 1 жніўня 1914 году. Таксама як і тады становішча надзвычай напружанае. Таксама як і тады агульны ваенны выбух пагражаюць «мясцовыя сутычкі і войны» у Азіі і Амэрыцы. Няхай гэтыя тэатры ваенных дзеяньняў знаходзяцца далёка ад эўрапэйскіх краін, але-ж вядома, што ваенныя падзеі могуць перанесьціся здалёку і ўспыхнуць у непасрэднай блізкасьці. Тое, што ў 1914 г. прадстаўлялі сабой Балканы (вогнішча сусьветнага пажару), прадстаўляе сабой зараз Эўропа. З моманту прыходу да ўлады Гітлера небясьпека нечаканага ўзьнікненьня вайны надзвычай узрасла.

Наколькі становішча сур'ёзнае, відаць з таго, як прайшла лёндонская эканамічная канфэрэнцыя і жэнэўская разьбраенчая камэдыя. Гэтыя канфэрэнцыі па «разьбраеньні», прыдуманыя для таго, каб прадэманстраваць падняволеным народам «любоў» іх уласьнікаў да міру, у сапраўднасьці служаць для абароны існуючых узбраеньняў і далейшага іх узмацненьня. Было-б абсурдам лічыць, што спрэчка паміж буйнымі капіталістычнымі дзяржавамі ідзе аб дробязях, так сказаць аб буры ў шклянцы вады. Зайздросна глядзяць апосталы міру, дэлегаты імпэрыялістычных дзяржаў, на Японію, якая спрытна здолела, пад носам Лігі нацый, ня гледзячы на пакт Келёга, заваяваць вялізарную тэрыторыю з пасельніцтвам у 50 мільёнаў чалавек. Яны тайна шкадуюць, што іх бацькаўшчыны не аказаліся такімі-ж «разумнымі», як Японія, і цяпер думаюць, як-бы нагнаць упушчанае. Ніхто ня думае аб тым, як-бы дапамагчы калегу па Лізе нацый—**Кітаю**, ніхто ня думае аб тым, каб пакараць парушальніка міру—**Японію**. Калі—ўсё-ж растуць варожыя галасы супроць Японіі, дык гэта таму, што яна першая апынулася ля крыніцы будучага размеркаваньня здабычы і дзяжуючы сваёй перавазе ўжо адарвала сабе вялікі кавалак авансам.

Пакт Лігі нацый, Вашынгтонская морская згода, пакт Келёга, Лёкарно і падобна заключаны «пакт чатырох»—усё больш і паўней дэманструюцца перад шырокімі масамі, як мэтады лепшай падрыхтоўкі новых войнаў і прыкрыцьцём урачыстых абяцаньняў міру. Ужо чуны заявы, што існуючы мір горшы за вайну. Зараз, з прычыны сусьветнага эканамічнага крызісу, стварылася такое безвыходнае становішча, што кіруючыя колы капіталістычных дзяржаў ужо робяць падобныя заявы, але, зразумела, у такой форме, што вінаватага ў гэтым трэба шукаць не ў сваёй, а ў чужой краіне.

Правакацыйнае выступленьне фашызму ў сярэдняй Эўропе адкрыла перад прадстаўнікамі капіталістычных дзяржаў дасканалую магчымасьць утоіць свае ваенныя падрыхтаваньні пад маскай тэзісу: мы не павінны пакінуць безабароннымі дэмакратыю і культуру нашай краіны перад тварам барбарскага германскага фашызму. У той-жа час Гітлер і яго паплечнікі крычаць: мы павінны вярнуцца да ўзбраеньняў, бо толькі гэтым шляхам нам удасца разарваць сьціскаючыя нас ланцугі Вэрсалю.

Што такая палітыка вельмі хутка прывядзе да вайны — не падлягае сумненьню. Гэта добра ведаюць такжа германскія зачышчыкі вайны. Але ў сувязі з тым, што яны, пры існуючых суадносінах сіл, устаноўленых антыгерманскай кааліцыяй, ня ўшэўнены ў пчасьлівым выніку вайны, яны стараюцца дасягнуць сваёй мэты абыходным шляхам. Кожны дзень у сувязі з абвастрэньнем гаспадарчага крызісу (ня гледзячы на ўсе адмаўленьні гэтага) расьце ваенная небясьпека. Асабліва абвастраецца нянавісьць супроць адзінай краіны, у якой няма крызісу, а наадварот, усё павялічваюцца тэмпы гаспадарчага будаўніцтва, — супроць СССР. Чым больш пацьвярджаецца, што пры сацыялістычнай сыстэме гаспадарка разьвіваецца, а пры капіталізьме яна разлагаецца, тым больш растуць інтэрвэнцыяністкія імкненьні супроць Савецкага Саюзу. Гэта хоча скарыстаць Гітлер у Германіі, паколькі ён сам ня ў стане вырашыць вынік вайны. Гэтым тлумачацца падарожжы агентаў Гітлера: Розэнбэрга, Гэбэльса, Герынга, Шахта ў Парыж, Лёндан, Вашынгтон, Рым і Варшаву, выступіўшых там з прапановай аб агульным паходзе супроць СССР. Падзел Савецкага Саюзу, аб якім мараць капіталісты, адкрыў-бы нехапаючыя ім рынкі для чакаемага повага гаспадарчага росквіту.

Спэкуляцыя Гітлера на нянавісьці ўсіх капіталістычных дзяржаў супроць Савецкага Саюзу па-свойму правільная. Але зусім няправільны спэкуляцыйныя разьлікі, што пры паходзе на Ўсход яму пры размеркаваньні здабычы ўдасца вырваць назад у сваіх саюзьнікаў ўсё тое, што ім было страчана на Захадзе ў рэзультаце сусьветнай вайны. Бальшавізм ненавідзяць на ўсёй капіталістычнай зямлі, але хіба ўзброены германскі імпэрыялізм не небясьпечны вораг? Хіба ён прымірыцца з гегемоніяй Францыі ў Эўропе, з панаваньнем ангельскага флёту на морах, з пазбаўленьнем Германіі калёніяў? Хіба ён адмовіцца ад канкурэнцыі з амэрыканцамі? Колькі пытаньняў, столькі адмоўных адказаў на прапановы Гітлера.

Гэтыя іменна адказы павялічваюць ваенную небясьпеку ў Сярэдняй Эўропе. Аб якіх-жа зьнешня-палітычных «посьпехах» можа тады гаварыць Гітлер, які абудзіў усе нацыяналістычныя інстынкты мас. Хіба ёсьць магчымасьць звароту страчаных у вайне частак краіны: Мэмэлю, Паморскага калідору, Верхняй Сылезіі, паўночнай часткі Шлезьвігу, Эйпэн—Мальмэду, Эльзас-Лётарынгіі і калёній? Відома, не. Нават «аншлюс» з Аўстрыяй без вайны неажыцьцёўны, ня кажучы пра аб'яднаньне ўжо новых тэрыторый, на якіх жывуць немцы.

Гітлераўскай сыстэме не ўдалося ўзьнавіць гаспадарчага становішча краіны і выразьніць «нацыянальнага» пытаньня, і ўсе прыхільнікі Гітлера, верыўшыя ў «нацыянальную рэвалюцыю», расчараваны. Што-ж застаецца рабіць Гітлеру, каб умацаваць уладу? Тэрор супроць рабочых арганізацый, пазбаўленьне рабочых усіх правоў, канцлягеры, катаваньні і сьмяротныя прыгаворы камуністам—невыстарчальны для таго, каб зрабіць незадаволеных здаволенымі. Не добраахвотна, а пад ушлывам узрастаючага нездавальненьня мас Гітлер пайшоў на шляху зьнішчэньня арганізацый і партый. У сваім стараньні ўнікнуць рэвалюцыі германскі капіталізм ухапіўся за фашысцкі тэрор. Пад тым-жа націскам мас гітлераўская сыстэма, калі яна ня хоча капітуляваць, павінна імкнуцца да вайны, нават пя будучы да яе падрыхтаванай. Капіталізм вядзе да вайны, тым больш тады, калі ён прыкрываецца фашысцкай тогай. Фашызм—гэта паскораны рух па шляху да вайны.

З прычыны таго, што Гітлер і яго афіцэры дасканала ўлічваюць, куды вядзе іх палітыка, яны плююць на ўсе забароненыя мірным дагаворам пункты аб узбраеньнях. Яны ўзбройваюцца нелегальна, яны ўзбройваюцца тайна, па ўсіх парах. У Германіі, ні ў адной галіне прамысловасьці, апрача ваеннай, не адчуваецца ажыўленьня. Некаторае ажыўленьне ў мэталюргіі выклікана заказамі на гарматы і маторы. У тэкстыльнай і швэйнай прамысловасьці стымул дан заказамі на ваеннае абмундыраваньне. Фабрыкі штучнага шоўку і хэмічныя заводы рыхтуюць атрутныя газы. У гарбарнай прамысловасьці — заказы на салдацкія боты і сёдлы. У аўтамабільнай вырабляюцца сродкі хуткага перасоўваньня. «Высокая» кан'юнктура выклікана выключна разьлікамі на хуткую вайну. У «працоўных лягерах», спартыўных саюзах «выхоўваецца» гарматнае мяса.

Палітыка ўзбраеньняў, разгрому рабочых арганізацый і крывавы тэрор павінны даць фашысцкай Германіі магчымасьць устаяць перад бурай, выклікапай буржуазіяй, якая разлагаецца.

Не чакаць вайны, якая прывядзе да падзеньня Гітлера, але арганізаваць рэвалюцыю супроць фашызму—вось у чым наша задача. Толькі гэтым шляхам мы скароцім гітлераўскую вайну, калі яна адбудзецца ня гледзячы на супраціўленьне рабочых мас.

2 жніўня Гітлер арганізуе «дзень салдата». У гэты дзень, вядома, ня будуць ушаноўваць простых салдат і не падпісуць ім «Саветаў салдацкіх дэпутатаў». 2 жніўня — дзень генэралаў і палкоўнікаў, чыёй волі да авантур і ўлады павінен будзе падначаліцца бяспраўны народ. Іх мэтай зьяўляецца—ператварыць Германію ў пруска-германскую казарму, як у часы Фрыдрыха, калі панавала палка. Гэта—ідэал для тупагаловага дробнага буржуа, але не для рабочага, [illegible] ён [illegible] гэта палітыка.

1 жніўня—міжнародны антываенны дзень для германскага рабочага мае асабліва значэньне. Ён зварачае яго [illegible] ня толькі на агульную ваенную небясьпеку, але і на тую асаблівую небясьпеку, якую прадстаўляе для Германіі гітлераўская сыстэма. Хто хоча змагацца супроць вайны, павінен змагацца супроць Гітлера. Хто яднаецца з Гітлерам «у імя свабоды Германіі», як гэта зрабілі сацыял-дэмакраты 17 мая 1933 г. у рэйхстазе, той робіць яшчэ большае злачынства, чым кайзэраўскія сацыялісты 4 жніўня.

Усюды ў Германіі, дзе толькі ёсьць рэвалюцыйныя рабочыя, яны павінны 1 жніўня актыўна выступіць супроць сыстэмы і палітыкі, вядучай да вайны. Чым мацней будзе гучэць наш голас, чым больш удасца ўцягнуць у гэты рух рабочых, тым больш ўдар будзе нанесен фашызму. Чым больш удала пройдзе дзень 1 жніўня ў Германіі, тым вастрэй будзе ўдар па карэнных «трэцяй імпэрыі». Гэта—акопы, з якіх працоўныя павінны павесьці атаку супроць свайго галоўнага ворага ва ўласнай краіне, супроць свайго германскага капіталістычнага крывапіўцы і яго «карычневай чумы».

Ф. Гекерт.

Сёньня палітмасоўка

Сёньня ў 7 гадз. увечары гарпрафсаветам арганізуецца вялікая палітмасоўка, прысьвечаная 30-годзьдзю другога зьезду УсеКП(б) і міжнароднаму антыімпэрыялістычнаму дню.

Мітынгі будуць праводзіцца ў цырку, на адчыненай сцэне саду, у петніх тэатры саду «Прафінтэрн», у трэку і памяшканьні яўрэйскага дзяржаўнага тэатру. Пасьля мітынгеў адбудуцца вялікія канцэрты, пастаноўкі і кіно сэансы. На гарадзкім стадыёне і ў трэку будуць нападжаны фізкультурныя спаборніцтвы, гульні і масавыя танцы. Уваход у сад — арганізаванымі калёнамі. У цырк, летні тэатр і яўрэйскі дзярж. тэатр — па білетах, якія распаўсюджаны па фабзаўмясцкомах.

Да дня авіяфлёту—18 жніўня поўнасьцю закончым збор сродкаў

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, ГАЗЭЦЕ „ЗЬВЯЗДА"

ГОМЕЛЬ, 31. (Па тэлеграфу).

Сёньня пераводзім у фонд эскадрыльлі імя Кагановіча 19.500 руб. Разам з пераведзенымі Гомельшчына ўжо ўнесла 100.900 руб. Збор сродкаў працягваецца.

Сакратар ГК КП(б)Б ШАФАРЭНКА.

* Рабочыя лесазаводу імя Халтурына (Фагачоў) адпрацавалі адзін дзень на пабудову авія-эскадрыльлі і грошы за гэты дзень у суме 700 руб. унесьлі ў фонд пабудовы эскадрыльлі. Апрача таго, рабочыя выслалі брыгаду ў падшэфны Запольскі сельсавет для правядзеньня масавай работы сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў і збору сродкаў на авія-эскадрыльлю.

* Работнікі Крычаўскага райаддзеленьня сувязі, агенты сувязі 1 калгасныя лістаносцы пастанавілі адлічыць у фонд пабудовы эскадрыльлі аднадзенны заработак і выклікалі на спаборніцтва ўсе ўстановы і прадпрыемствы г. Крычава.

* Дактары клінічнага гарадку на агульным сходзе пастанавілі адлічыць аднадзенны заработак у фонд пабудовы эскадрыльлі. Адлічылі аднадзенны заработак таксама дактары Пухавіцкай больніцы, якія выклікалі Сьмілавіцкую больніцу і аптэку. Апрача таго, МК Пухавіцкай больніцы вылучыў 4 брыгады з медперсаналу для правядзеньня падпіскі на эскадрыльлю сярод рабочых арцелей.

Расьнін.

Закрыўся першы ўсебеларускі зьезд работнікаў юстыцыі

30 ліпеня г. г. скончыў работу першы ўсебеларускі зьезд работнікаў юстыцыі.

Па дакладу Наркамюста т. **Кузьміна** аб задачах органаў юстыцыі разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Усяго ў спрэчках выступіла каля 50 чалавек.

З вялікай прамовай выступіў намесьнік наркома РСІ і старшыні ЦКК тав. **Конін**, які завастрыў увагу зьезду на неабходнасьці рашучай перабудовы ўсёй работы органаў юстыцыі і шчыльнай увязкі яе з работай органаў РСІ.

На зьезьдзе выступіў нам. пракурора Саюзу ССР т. **Вышынскі**, які ў 2-х гадзінной прамове даў канкрэтную праграму дзейнасьці органаў юстыцыі і ў паасобку кожнага супрацоўніка на ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі ў правядзеньні сацыялістычнай законнасьці.

Зьезд прыняў рэзалюцыю, якая вызначыла канкрэтныя мерапрыемствы і задачы органаў юстыцыі ў справе выкарананьня палітычна-гаспадарчых задач.

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі НКЮ БССР т. Кузьмін падвёў вынікі работы зьезду і заклікаў усіх работнікаў юстыцыі прыняць тэрміновыя меры да перабудовы работы.

На гэтым зьезд скончыў сваю работу.

Сьпіс

партспраў, прызначаных на разгляд ПТ ЦКК у Магілеве 4-VIII-33 г. па Чавускаму раёну

Жукаў П., Панфіловіч М. М., Осіпаў І. А., Ерашэнка А. Р., Шпакоў Вэндыкт, Скачкоў І. А., Рогулеў М. М., Кацкоў Г. П., Шубакоў К. Л., Бардоўскі П. М., Радзеўскі К. К., Парфенаў А. П., Новікаў Р. В., Пісараў Я. Д., Богаслоў М., Цімашэнка В., Лосеў П. С., Палоў А. М., Маргунскі А. Ф., Драчоў С. П., Калясьнёў В. С., Маркаў С. Н., Белавусаў, Яўсеенка Е. І.

Сьпіс

партспраў, прызначаных на разгляд ПТ ЦКК па Крычаўскаму раёну ў горадзе Магілеве 3-VIII-33 г.

Савва А. Г., Новікаў Т., Цітаў М. В., Рашынскі І. І., Сводкаўскі П. Ц., Гомелька Е., Зайцаў І. В., Карасёў Г. Г., Церапчэнка В. Л., Раніловіч А., Гарбатоўскі І. Ф., Спурын П., Кірэенка С. М., Ключкоў П. А., Міхневіч М. Г. Сярдзюкоў.

Назначэньні

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў зацьвердзіць склад цэнтральнай камісіі дапамогі дзецям пры прэзыдыуме ЦВК БССР: А. Г. ЧАРВЯКОЎ—старшыня камісіі, МАЙЗІТ—намесьнік старшыні і члены РУТЭНБЭРГ, НІКАЛАЕЎ, ГУРЭВІЧ.

Народным камісарам юстыцыі БССР і пракурорам рэспублікі прызначан тав. КУЗЬМІН П. В.

Намесьнікам старшыні Савету Народных Камісараў БССР прызначан тав. СААКЯН.

Сьпіс

ПАРТСПРАЎ ПА Г. МАГІЛЕВЕ, ПРЫЗНАЧАНЫХ НА РАЗГЛЯД ПТ ЦКК У МАГІЛЕВЕ 5-VIII-33 Г.

Ефрэмаў Ф. І., Мяцеліца С. А., Ваўчкоў, Капусьцін І. П., Дардыкін К. С., Браніцкі Р. Г., Верхін Я. І., Кісьлякоў А. В., Ліпешкін С. А., Цалкін М. М., Гельфанд С. Е., Маневіч І. І., Цыплякоў І. І., Сорын М. Х., Ратнікаў Т. А., Харсун Я. М., Абрамаў С., Кукес Х. Э., Мапароўскі Т. П., Лыскоўскі М. М., Данілаў Д. Е., Міхайлаў К. В., Бляхман, Судзілоўскі Ф. І., Вусаў С. А., Іваноў А. В., Будрык Клім, Казлоў П. В., Акулёнак Т. М., Крэньдзель В. М., Таторын І. І., Кавалёў І. В., Красноўскі Д. І., Полтарын В. А., Глушко Я. Н., Калістратаў І. А., Падкоўскі В. В., Ільгошын Н. С., Лазурчук, Красочка М. О., Мікалуцкі І. І., Фурадзееў П. А., Харкевіч Адам, Кроль Я. Г.

ПЯТРУСЬ БРОУКА

1914

(Урыўкі з поэмы)

І.

Пад крывою сахой
затуцелі нарогі,
камянямі ляглі
на шнурах дзірваны.
Бабы енчылі полем
і прасілі ў бога
сканчэньня вайны.
Абцугамі душылі
за горла клапоты,
перасушалі рукі
мазалёў вужлакі.
Вечарамі жанкі
галасілі ўпотай,
Сьнілі ў душныя ночы,
што прышлі мужыкі.
Да касьцей зьнябыліся.
У ратунак зьняверылі,
бо хадзіла вайна —
акрываўлены зьвер.
Трэці год
вявала імпэрыя
і салдацкай шынэляй
прыбралася сьмерць.
Бабы клікалі бога —
ён наводзіў марціры,
бог расьнепчаны,
сыты панок!
Ён па штабах хадзіў
у генэральскім мундзіры,
яму некалі слухаць
пакутных жанок.
Яму некалі думаць,
што ступелі нарогі,
што скавалі зямлю
камянём дзірваны,
што прасілі жанкі
у яго дапамогі —
бог сядзеў ў першай лёжы
тэатра вайны.
Ён забраў мужыка,
забраў бацьку і сына
прычапчаць іх атрутай,
гарматным агнём —
Бог прымаў ў габінэце
«за яго, за цара і айчызну»,
над крыжамі дарогі
ішлі да яго.

А пасьля дзірваноў,
нявуабаве, па часе —
голад выслаў на вёскі
заклапочаны бог—
той хадзіў як кашчэй
у худой апранасе
ад суседа к суседу,
ад парога ў парог.
Нагала вымятаў ён
бяздоннаю жмяняю,
на сталё лепшай стравай
сталла трава.
Хмары чорнага волава
плылі затуменьнямі,
па вар'яцку крычала
праз ночы сава.
Грудзі ціснула боль,
жываты падцінала,
за айчыну любоў
несла гурмы пакут,
раптам вестка:
прышоў кавалер усіх крыжоў і мэдаляў
нападважны ваяка
Сымон Перагуд.
Ён прышоў, як казалі,
біз ног з-пад Карпатаў,
не хапала грудзей
для мэдаляў яго.
Ён прышоў, як казалі,
найдважным салдатам
перайшоўшы дратм
і ваду і агонь.
Па пятнаццаць на штых
надяваў чужаземцаў,
будзе знаць
хто на веру і цара паўстае.
Аскабалкамі рук,
што пакінулі немцы
гладзіў ён
заслужоныя грудзі свае.
Ён законна адпушчаны.
Толькі ня зьбеглы!
Перагуд ня стрывае
абразы такой.
Валасны старшыня
з барадою ў дзьве цэглы
кіраваў каламажкай
дзе ехаў герой.
Яго весьлі з пашанай
быццам новае цуда,
нібы гэтаму цуду
цаны яшчэ няма.
Побач земскі начальнік
падпіраў Перагуда,
Станавы Верхаплюйкін
за плечы трымаў.
Быццам побач яго
ганаровую вартай —
пільнавалі вакол
Перагуда яны.
Так зьявіўся герой
на абшары свайго уладарства,
дзе ўсьцяж не прайдуць
нават дзьве бараны.
Над дугою званкі
заліваді звонка...
Вось і хата,
каторую часта ён сьніў —
з-за разьбітае брамы
выцяўзала жонка
і зьнясіліўшы пала
На вуліцы ніц.
Бегці з поля суседзі паглядзець.
Паразважаць,
што там вуліца так
ля Сымона гудзе.
Кандыбалі дзяды
з барадою ў сажань,
абружалі жанкі
з чарадою дзяцей.
На калёсы стаў земскі,
як сасна тая тонкі,
Перагуда ўзяў,
над галоўмі ўзьнёс.
Суціскалі кабеты
Сымонаву жонку, —
паглядзі,
быццам зоры
мэдалі прывёз!
А яе сьлёзы крыўды
наскрозь праціналі,
рваўся з сэрца крывавы
дажору агонь.
Валасы яна рвала:
— не хачу я мэдаляў!
Мне рукі і ногі
падайце яго!
А пакуль той натоўп
сунімалі ад гуду,
земскі ўсьцінуў героя,
што абсмалены пень,
ён патрос у гары
жываты Перагуда
і паставіў яго
у сябе ля кален.
Земскі гойкаў з калёс.
А кабеты стаялі,
на калёсы глядзелі,
расчыніўшы раты.
«Слава! слава герою
ўсіх крыжоў і мэдаляў,
што прайшоў непашкоджаным
ўсе франты,
што прайшоў непарушным
баявыя паходы,
дзе за веру змагалася
наша зямля.
Мала хто даслужыўся
такой нагароды,
першы чын генэрала
мэдалі чапляў.
Атрымаў за айчыну
заслугі такія,
бо прайшоўся між куль
у разьюшаны град.
Вось такіх не забудзе
ніколі Расія,
хай працуе
Сымон Перагуд наш.
Ура!».
Станавы заравеў
на ваколіцы гулка,
Валасны старшыня
распусьціў дзікі гойк,
і бязногі Сымон
быццам тая качулка
гойкнуў раз пад начальства
і зьбянтэжаны змоўк.—
Ўсе стаялі нямымі,
як прыбітыя сьцені,
дух вялікай Расіі
да іх сэрца ня йшоў.
Жонка білася вобзем
і прасіла збавеньня,
яна ногі шукала
заместа крыжоў.
Так, казалі, прышоў
бяз ног з-пад Карпатаў,
ахрышчоны агнём
і франтамі пакут.
Так казалі прышоў
найдважным салдатам
заслужоны ваяка
Сымон Перагуд

II.

І зноў над вёскай
плылі дні
у чорных хмарках
валаснных—
Галену ўсім нясьці
яны,
згрызоты новыя
і раны.
Гармат равеў
шалёны гром,
а цар на сьмерць
няшчадна гнаў—
на чорных скрыдлах
грукапом
па сьвеце лётала
вайна.
Зямлёй ліліся
кроў і гной,
на ямы зрыліся палі—
калекі з фронту
чарадой
на мейсца збураное
йшлі.
Схадзілі моракі
ачмут
і разгараўся злосьці
жар —
бездапаможны
Перагуд
на лаве
тумбаю ляжаў.
Кругом
валодала мана,
яе дарогі
былі просты—
падаткі сыпаў
старшыня
не ўспамінаючы
геройства.
Яны ішлі
з уціскам новым,
адно, што ведалі —
карацьь.
Забраў
апошнюю карову,
той прыстаў,
што крычэў: ура!
Адчуўшы праўду
жорсткіх дзён,
цану спазнаўшы
абяцанкам —
зубамі рваў
мэдалі ён
як непатрэбныя
бляшанкі.
Яго сьвяцейшая
зямля
ў абдымкі кінула
галецтва —
сваё геройства
ён пракляў,
і горка думаў
пра калецтва.
Ён рваў крыжы
і раскідаў,
а боль прыходзіла
ізноўку,
бо жонка поўзала
як здань
і дзеці пухлі
з галадоўкі.
Ён прыгадаў
часіны тыя,
пакуты зьнесенай
цяжар —
Дык вось дзе
матушка Расія,
вялікі бог
і белы цар!
Сірот бяздомных
ім ня шкода,
крывёю праўду ён знайшоў —
Дык вось яна дзе,
нагарода,
цана мэдалям
і крыжом.
Забіты, кінуты на вёдзек,
ярмо зрываючы
прынук
качаўся
ён, паўчалавек,
крычэў зьняможна:
проч вайну!
Прарваўшы
зчараваны круг,
яму
ясьнелася зара.
Ён аскабалкамі
біў рук: —
Далой вайну!
Далоў цара!

III.

Вайна ёй імя.
Больш назвы пагавай
вікам ня ўдасца
такой прыгадаць —
у безьліч шкілетаў
яна ўвабрала,
мільёны калек
па дарогах ляжаць.
Яна праляцела
зьнішчальнаю лавай,
раськінуўшы ў сьвеце
нязьлічана рам —
паном на багацьце,
царом на забаву,
на пэўную сьмерць
для рабочых, сялян.
Яна ліхаманкай
праходзіла ўсюды,
зьнішчала палеткі,
зьнішчала завод.
Мільёны пакінула
нам Перагудаў
і сьцены гаротных,
бяздомных сірот.
Крывёй мы шукалі
збавеньня ратунак
і нашыя сьцяці
крывёю гараць.
Мы сэмі вайне
падлічылі рахунак.
прагналі паноў
і прагналі цара.
Мы біліся доўга
з разьюшаным панам,
працоўных сусьвету
яднаді хаўрус.
Мы цяжкаю працай
залечылі раны
і горда квітнее
Савецкі Саюз.
А там, за мяжою,
старое ярмо
на шыі працоўных
гнуць.
Не да спадобы ім
нашая моц —
рыхтуюць ізноў
вайну.
На іхнія танкі,
на іхні газ,
за вечную боль
і вёдзек, —
Ратуй-жа таварышы,
такі адказ,
каб зьнішчыць вайну
навек!
Сьцяною жалезных,
працоўных калён —
упартым у бойцы
будзь!
Каб земнаю куляю
вырас, ён,
сусьветны
Савецкі Саюз!

Мінск, друкарня «Зьвязды»

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Галоўлітбел № 337.